МІНІСТЭРСТВА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ХАРЧАВАННЯ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ

«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АГРАРНЫ ТЭХНІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ»

Кафедра філасофіі і гісторыі

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

***Метадычныя рэкамендацыі***
***і тэматыка кантрольных работ***
***для студэнтаў дзённага і завочнага аддзяленняў***

**Мінск 2007**

УДК 947.6(07)
ББК 63.3(45Беи)я7
Г 51

Рэкамендаваны да выдання навукова-метадычным саветам аграмеханічнага факультэта БДАТУ.

Складальнікі: канд. гіст. навук, дацэнт *В.Г. Маскалёў*;
выкладчык *К.А. Шумскі*

Рэцэнзенты: канд. гіст. навук, дацэнт *С.А. Мышапуд*;
канд. філас. навук, дацэнт *В.Р. Языковіч*

Г-51 Гісторыя Беларусі : метадыч. рэкамендацыі і тэматыка кантрольных работ для студэнтаў дзённага і завочнага аддзяленняў / склад. В.Г. Маскалёў, К.А. Шумскі. — Мінск : БДАТУ, 2007. — 59 с.

УДК 947.6(07)
ББК 63.3(45Беи)я7

© БДАТУ, 2007

# ЗМЕСТ


УВОДЗІНЫ . . . . 4
АГУЛЬНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ . . . . 7
МЕТАДЫЧНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ КАНТРОЛЬНАЙ РАБОТЫ . 8
АГУЛЬНАЯ ЛІТАРАТУРА, РЭКАМЕНДАВАНАЯ ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ КУРСА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ . . . . 9
ТЭМА 1 Старажытнае грамадства на тэрыторыі Беларусі . . . . 10
ТЭМА 2 Паходжанне беларусаў . . . . 11
ТЭМА 3 Старажытныя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі ў IX — першай палове XIII ст. . . . . 12
ТЭМА 4 Сацыяльна-эканамічнае, рэлігійнае і культурнае становішча на беларускіх землях у IX — першай палове XIII ст. . . . . 13
ТЭМА 5 Утварэнне і станаўленне Вялікага княства Літоўскага . . . . 14
ТЭМА 6 ВКЛ у XIV–XVI стст.: сацыяльна-эканамічнае развіццё, дзяржаўна-палітычны лад, культура . . . . 16
ТЭМА 7 Стварэнне Рэчы Паспалітай і яе развіццё ў другой палове XVI — першай палове XVII ст. . . . . 17
ТЭМА 8 Беларускія землі ў другой палове XVII — XVIII ст. . . . . 19
ТЭМА 9. Культура беларускіх земляў у XVII–XVIII стст. . . . . 20
ТЭМА 10 Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі на мяжы XVIII–XIX стст. . 21
ТЭМА 11 Беларусь і расійска-французская вайна 1812 г. . . . . 23
ТЭМА 12 Грамадска-палітычны рух на Беларусі ў першай палове XIX ст. . . . . 24
ТЭМА 13 Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у першай палове XIX ст. . . . . 25
ТЭМА 14 Культура Беларусі ў першай палове XIX ст. . . . . 27
ТЭМА 15 Станаўленне буржуазнага грамадства на Беларусі . . . . 29
ТЭМА 16 Развіццё капіталізму на Беларусі ў другой палове XIX ст. . . . . 30
ТЭМА 17 Паўстанне 1863–1864 гг. на Беларусі . . . . 31
ТЭМА 18 Сацыяльная барацьба на Беларусі ў другой палове XIX ст. . . . . 33
ТЭМА 19 Фарміраванне беларускай нацыі . . . . 34
ТЭМА 20 Рэвалюцыя 1905–1907 гг. на Беларусі . . . . 35
ТЭМА 21 Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча на Беларусі ў 1907–1913 гг. . . . . 37
ТЭМА 22 Беларусь у гады Першай сусветнай вайны . . . . 38
ТЭМА 23 Беларусь на пераломе эпох: люты–снежань 1917 г. . . . . 39
ТЭМА 24 Барацьба за стварэнне беларускай дзяржаўнасці (1917–1918 гг.) . . . . 41
ТЭМА 25 Беларусь у перыяд польскай інтэрвенцыі і Грамадзянскай вайны 1919–1920 гг. . . . . 42
ТЭМА 26 Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва на Беларусі ў 1919–1926 гг. . . . . 43
ТЭМА 27 Сацыяльна-эканамічны і культурны ўздым 20-х гг. . . . . 45
ТЭМА 28 Эканамічнае развіццё Беларусі ў гады першых пяцігодак. Усталяванне таталітарнага рэжыму (1928 — чэрвень 1941 г.) . . . . 46
ТЭМА 29 Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы (1921–1939 гг.) . . . . 47
ТЭМА 30 Беларусь напярэдадні і ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны . . . . 49
ТЭМА 31 Беларусь ва ўмовах нямецкай акупацыі 1941–1944 гг. Вызваленне Беларусі . . . . 50
ТЭМА 32 БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе (1945–1955 гг.) . . . . 52
ТЭМА 33 БССР у сярэдзіне 50-х — 80-х гг. . . . . 53
ТЭМА 34 Беларусь на шляху сістэмных пераўтварэнняў (1985–2007 гг.) . . . . 55
ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ . . . . 57

# УВОДЗІНЫ

Значным фактарам, які забяспечвае поспех у працы студэнтаў, з'яўляецца ўменне арганізаваць сваю самастойную работу над вучэбным матэрыялам у міжсесійны перыяд. Самастойная праца складаецца з шэрагу элементаў, адным з якіх з'яўляецца выкананне кантрольнай работы.

Выкананне кантрольных работ развівае мысленне, прывівае навык пісьмовага выкладання, вучыць творчаму даследчаму падыходу да канкрэтнага вучэбнага матэрыялу. Для студэнтаў напісанне кантрольных работ мае выключнае значэнне, бо дапамагае крытычна асэнсаваць першакрыніцы і разнастайны дакументальны матэрыял, удасканаліць свае веды па гісторыі Беларусі, асэнсаваць месца гісторыі Беларусі ў агульнагістарычным працэсе.

Кантрольная работа адносіцца да разраду работ, якія навучаюць і разам з гэтым маюць кантралюючы характар. Выкананне яе з'яўляецца важным сродкам самакантролю ведаў студэнта, залогам глыбокага і трывалага засваення вучэбнага матэрыялу, а таксама садзейнічае падрыхтоўцы да залікаў і экзаменаў. Выкананне пісьмовых кантрольных работ садзейнічае і ўстанаўленню кантакту студэнта з выкладчыкамі, кафедрай, што, у сваю чаргу, уплывае на эфектыўнасць кіравання самастойнай працай студэнтаў. Афармленне і змест выкананай кантрольнай работы дае выкладчыку падставу для меркавання аб падрыхтоўцы студэнта, аб яго ўменні працаваць над вучэбным матэрыялам, аб недахопах у ведах і г. д. Гэта дазваляе своечасова выпраўляць і тлумачыць студэнту зробленыя ім памылкі.

Зразумела, што пісьмовыя работы, у тым ліку і кантрольныя, не могуць служыць падставай для канчатковай ацэнкі ведаў студэнтаў, але тым не менш яны дазваляюць зрабіць вывад аб праведзенай імі самастойнай працы на працягу семестра, вучэбнага года, аб падрыхтоўцы да здачы залікаў і экзаменаў.

Такім чынам, кантрольная работа — гэта своеасаблівая форма выяўлення ўзроўню пазнавальных магчымасцей студэнта. Гэта першы крок да

самастойнай даследчай працы, выконваючы яе, студэнт атрымлівае навыкі, неабходныя для напісання курсавых работ.

Тэмы кантрольных работ вызначаны ў межах праграмы курса гісторыі Беларусі. Кантрольная работа выконваецца на падставе той літаратуры, якая рэкамендавана да кожнай тэмы, а таксама з улікам новых выданняў, апублікаваных па дадзенай праблематыцы.

Перад тым як пісаць кантрольную работу, трэба прадумаць суадносіны асобных яе частак — уводзінаў, асноўнай часткі, заключэння, улічваючы, што кантрольная работа па любой тэме павінна быць **аб'ёмам не менш за 14 старонак. Сярэдні аб'ём роўны 24 старонкам**.

**Ва ўводзінах** коратка канкрэтызуецца тэма, даецца характарыстыка выкарыстанай літаратуры. У канцы ўводзінаў дакладна вызначаюцца задачы, якія паставіў аўтар у кантрольнай рабоце.

Далей раскрываецца **змест пытанняў**, адказ на кожнае з якіх — невялікая самастойная частка кантрольнай работы. Часцей за ўсё ў кантрольнай рабоце бывае тры-чатыры пытанні.

**У заключэнні** аўтар робіць вывады па ўсёй рабоце (кожнае пытанне, што разглядаецца ў кантрольнай рабоце, павінна мець свае вывады), разглядае ўзаемасувязь даследаванага матэрыялу з наступнымі гістарычнымі падзеямі, з сучаснасцю. Заключэнне па аб'ёме павінна быць меншым за іншыя часткі работы і складаць адну-дзве старонкі.

За заключэннем ідзе **спіс выкарыстанай літаратуры**, г. зн. бібліяграфія.

Кантрольная работа павінна быць акуратна і правільна аформлена. Чыставы варыянт работы змяшчае тытульны ліст, тэкст, што напісаны ў сшытку або на сашчэпленых лістах, неабходны даведачны апарат. Афармляючы кантрольную работу, студэнт прытрымліваецца вызначанага парадку: на вокладцы ён указвае неабходныя звесткі, на наступнай старонцы падае назву тэмы і план, пасля чаго выкладаецца змест (неабходна пакінуць палі для

паметак рэцэнзента), усім часткам работы ў тэксце трэба даць загалоўкі, скарачэнні слоў не дазваляюцца, старонкі нумаруюцца.

Неабходна дакладна афармляць даведачны апарат і спасылкі ў тэксце работы на выкарыстаную літаратуру. Пры першым упамінанні той ці іншай кнігі ў тэксце ў канцы фразы ставіцца лічба 1, а ўнізе старонкі пад гэтай лічбай — прозвішча і ініцыялы аўтара, назва кнігі, месца выдання, выдавецтва, год выдання, а пры цытаванні тэксту (які абавязкова бярэцца ў двукоссе) — нумар старонкі. Выдавецтва ўказваць пажадана, але не абавязкова.

Пры паўторным упамінанні крыніцы ў тэксце работы робіцца зноска ўжо без выхадных даных (месца і года выдання), але абавязкова з указаннем старонкі або старонак (калі ідзе пераказ зместу некалькіх старонак).

Зноскі (іх можа быць некалькі) трэба рабіць унізе старонкі пад рыскай, а не на палях і не ў тэксце работы. Практыкуецца і іншая форма: спасылкі на выкарыстаную літаратуру ў тэксце нумаруюцца (1, 2, ..., 10, ... і г. д.), а самі зноскі пад гэтымі нумарамі выносяцца ў канец кантрольнай работы, пасля заключэння. Студэнт можа выбраць для сябе любую з пералічаных форм.

Пры складанні спісу выкарыстанай літаратуры неабходна таксама прытрымлівацца агульнапрынятага ў навуковай практыцы парадку. Спіс выкарыстанай літаратуры падаецца ў алфавітным парадку, з указаннем прозвішча і ініцыялаў аўтара, назвы кнігі, часопіса, зборніка ці артыкула, месца і года выдання.

Выкананая кантрольная работа дасылаецца ва ўказаны тэрмін метадысту, які перадае яе на рэцэнзію выкладчыку.

Дыферэнцыраваная адзнака за кантрольную рабоцу не выстаўляецца. Незалічаная кантрольная работа аддаецца студэнту для перапрацоўкі, а затым зноў рэцэнзуецца.

Студэнты, якія не атрымалі заліку па кантрольнай рабоце да пачатку сесіі, да здачы заліку ці экзамену не дапускаюцца.

## АГУЛЬНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ

Згодна з вучэбным планам, студэнт выконвае адну кантрольную работу па гісторыі Беларусі. Тэма кантрольнай работы выбіраецца згодна з індывідуальным шыфрам студэнта (нумар заліковай кніжкі). Выконваць кантрольную работу можна толькі па тых тэмах, якія датычаць да шыфра студэнта (работа, напісаная не па сваім шыфры, не рэцэнзуецца і не залічваецца).

Для правільнага выбару неабходна кіравацца наступнай табліцай.

Табліца

Размеркаванне тэм кантрольных работ па гісторыі Беларусі
для студэнтаў дзённага і завочнага аддзяленняў

| Апошняя лічба шыфра студэнта | Нумар тэмы работы |
|---|---|
| 1 | 1; 11; 21; 31 |
| 2 | 2; 12; 22; 32 |
| 3 | 3; 13; 23; 33 |
| 4 | 4; 14; 24; 34 |
| 5 | 5; 15; 25 |
| 6 | 6; 16; 26 |
| 7 | 7; 17; 27 |
| 8 | 8; 18; 28 |
| 9 | 9; 19; 29 |
| 0 | 10; 20; 30 |

Кантрольная работа выконваецца па адной з прапанаваных тэм. Напрыклад, студэнт, чый шыфр заканчваецца лічбай 5, выконвае толькі **адну з трох** магчымых тэм (ці тэму 5, ці тэму 15, ці тэму 25). Выкладчык на ўстановачнай сесіі можа ўдакладніць студэнту нумар тэмы яго кантрольнай работы. Кантрольная работа павінна быць прадстаўлена не пазней чым за месяц да пачатку сесіі.

## МЕТАДЫЧНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ КАНТРОЛЬНАЙ РАБОТЫ

– Кантрольная работа павінна быць напісана дакладна згодна з заданай тэмай і планам;
– нельга даслоўна перапісваць тэкст з вучэбных дапаможнікаў, кніг, артыкулаў;
– адказы на пытанні ў тэксце кантрольнай работы павінны быць абазначаны нумарам, узгодненым з нумарам пункта плана (рымскай лічбай);
– цытаты, лічбы і факты, што былі прыведзены ў тэксце работы, павінны мець спасылкі на крыніцу з указаннем прозвішча і ініцыялаў аўтара, назвы крыніцы, месца і года выдання. Спасылкі робяцца на той жа старонцы, пад тэкстам;
– кантрольная работа абавязкова выконваецца разборлівым почыркам ці друкуецца на камп'ютэры. Усе старонкі работы павінны быць пранумараваны, мець палі і месца для заўваг рэцэнзента;
– у канцы тэкста работы неабходна прывесці спіс выкарыстанай літаратуры з указаннем прозвішча і ініцыялаў аўтара, назвы працы, тома, главы, параграфа, месца і года выдання;
– у канцы працы трэба паставіць подпіс аўтара і дату адпраўкі кантрольнай работы ва універсітэт;
– пры паўторным прадстаўленні работы неабходна дадаць і незалічаны варыянт з заўвагамі рэцэнзента.

## АГУЛЬНАЯ ЛІТАРАТУРА, РЭКАМЕНДАВАНАЯ ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ КУРСА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ


1. Беларусазнаўства : навучальны дапаможнік / пад рэд. П.І. Брыгадзіна. — Мінск : Завігар, 1998.
2. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. — Мінск : Выш. школа, 2006.
3. Гісторыя Беларусі : вучэбны дапаможнік для ВНУ / пад рэд. А.Г. Каханоўскага, А.А. Яноўскага. — Мінск : Эканомпрэс, 1997.
4. Гісторыя Беларусі : навучальны дапаможнік / А.Г. Каханоўскі [і інш.]. — Мінск : ФУАінфарм, 2001.
5. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. Ч. 1. Са старажытных часоў да канца XVIII ст. : курс лекцый / І.П. Крэнь [і інш.]. — Мінск : РІВШ БДУ, 2000; — Ч. 2. XIX–XX стст. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. — Мінск: РІВШ БДУ, 2002.
6. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / рэд. кал.: Ігнаценка І.М. [і інш.]. — Мінск : Навука і тэхніка, 1971, 1972, 1975, 1977.
7. Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі / М.В. Доўнар-Запольскі. — Мінск : БелЭН, 1994.
8. Ілюстраваная храналогія Беларусі : у 2 ч. / склад. І.П. Хаўратовіч. — Ч. 1. — Мінск : БелЭН, 1995; Ч. 2. — Мінск: БелЭН, 1997.
9. История Беларуси с древности до наших дней : учеб. пособие / П.Г. Чигринов. — Минск : Книжный дом, 2004.
10. История Беларуси : учебно-информационное пособие / под ред. А.Г. Кохановского, О.А. Яновского. — Минск : ФУАинформ, 2001.
11. Казлоў, Л. Беларусь на сямі рубяжах / Л. Казлоў, А. Цітоў. — Мінск : Беларусь, 1993.
12. Качаноўскі, У.У. Гісторыя культуры Беларусі : вучэбны дапаможнік для студэнтаў ВНУ / У.У. Качаноўскі. — Мінск : Выш. школа, 1994.
13. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. — Мінск : Экаперспектыва, 1996.
14. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / пад рэд. М.П. Касцюка [і інш.]. — Ч. 1. — Мінск : Беларусь, 1994; Ч. 2. — Мінск: Беларусь, 1995.
15. Сагановіч, Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. / Г. Сагановіч. — Мінск : Энцыклапедыкс, 2001.
16. Саракавік, І.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.А. Саракавік. — Мінск : Современная школа, 2006.
17. Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002) / З. Шыбека. — Мінск : Энцыклапедыкс, 2003.
18. Эканамічная гісторыя Беларусі / пад рэд. В.І. Галубовіча. — Мінск : Экаперспектыва, 1999.
19. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. — Мінск : БелЭН, Т. 1. — 1993; Т. 2. — 1994; Т. 3. — 1996; Т. 4. — 1997; Т. 5. — 1999; Т. 6. — 2001.
20. Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя. — Мінск : БелЭН, 1989.

## ТЭМА 1 Старажытнае грамадства на тэрыторыі Беларусі

1. Пранікненне старажытнага чалавека на тэрыторыю Беларусі:
   – заняткі і прылады працы старажытных людзей у каменным веку;
   – жыцце ва ўмовах ледавіка.
2. Бронзавы век:
   – пераход ад спажывецкай да вытворчай гаспадаркі;
   – рассяленне індаеўрапейскіх плямёнаў на тэрыторыі Беларусі.
3. Жалезны век:
   – выплаўка і апрацоўка жалеза;
   – сацыяльна-эканамічнае развіццё плямёнаў;
   – зараджэнне вераванняў і ўзнікненне мастацтва.

### Літаратура


1. Археалагія Беларусі : у 4 т. — Т. 1. — Мінск : Беларуская навука, 1997.
2. Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыклапедыя. — Мінск : БелЭН, 1993.
3. Гісторыя Беларусі : у 6 т. Т.1. Старажытная Беларусь. Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XII ст. — Мінск : Экаперспектыва, 2000.
4. Загорульский, Э.М. Древняя история Белоруссии : Очерки этнической истории и материальной культуры / Э.М. Загорульский. — Минск : Изд-во БГУ, 1977.
5. Калечыц, А.Г. Першыя людзі на зямлі Беларусі / А.Г. Калечыц. — Мінск : Беларусь, 1997.
6. Нарысы гісторыі Беларусі : Т. 1. — Мінск : Беларусь, 1994.
7. Пілецкі, В.А. Старажытнае грамадства на Беларусі : вуч. дапаможнік / В.А. Пілецкі. — Мінск : БДПУ, 1996.
8. Сагановіч, Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. / Г. Сагановіч. — Мінск : Энцыклапедыкс, 2001.
9. Саракавік, І.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.А. Саракавік. — Мінск : Современная школа, 2006.


Першыя спробы старажытнага чалавека пранікнуць на тэрыторыю Беларусі датуюцца прыкладна 35 тыс. гадоў назад, людзей таго часу называюць краманьёнцамі, чаму? Якія Вы ведаеце найстаражытнейшыя стаянкі на тэрыторыі Беларусі, калі яны існавалі? У той час чалавек браў ад прыроды ўсё ў гатовым выглядзе. Як называецца такі від гаспадаркі?

Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі пачаўся на мяжы III і II тысячагоддзяў да н. э. і доўжыўся прыкладна да пачатку I тысячагоддзя да н. э.

У гэты час з'яўляюцца вырабы з медзі і бронзы, але на тэрыторыі Беларусі не было радовішчаў медзі і волава, сплаў якіх утварае бронзу. Адкуль трапляюць медзь і волава на тэрыторыю Беларусі? Раскажыце пра асноўныя заняткі мужчын і пра ролю мужчынскай працы.

Зараджэнне вытворчых формаў гаспадарання — земляробства і жывёлагадоўлі. Зараджэнне грамадскага падзелу працы. Першапачатковы абмен.

Раскажыце аб розных канцэпцыях прарадзімы індаеурапейцаў: хто яны такія і адкуль прыйшлі.

У адказе на трэцяе пытанне дайце храналагічныя рамкі жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі. Якім спосабам людзі навучыліся здабываць жалезную руду?

Сацыяльна-эканамічнае развіццё плямёнаў эпохі жалеза. Рассяленне ўсходнеславянскіх плямёнаў на тэрыторыі Беларусі. Рэлігійныя вераванні і абрады. Першабытнае мастацтва.

## ТЭМА 2 Паходжанне беларусаў

1. Насельніцтва Беларусі ў сярэдзіне I тысячагоддзя н. э.
2. Балты і славяне.
3. Крывічы, дрыгавічы, радзімічы, іх адносіны з суседзямі.
4. Асноўныя канцэпцыі аб паходжанні беларусаў.

## Літаратура


1. Гісторыя Беларусі : вучэбны дапаможнік : у 2 ч. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. — Мінск : Універсітэцкае, 1998.
2. Грынблат, М.Я. Беларусы / М.Я. Грынблат. — Мінск : Навука і тэхніка, 1968.
3. Нарысы гісторыі Беларусі : Ч. 1. — Мінск : Беларусь, 1994.
4. Пилипенко, М.Ф. Возникновение Белоруссии: Новая концепция / М.Ф. Пилипенко. — Минск : Беларусь, 1991.
5. Седов, В.В. Восточные славяне в VI–XIII вв. / В.В. Седов. — Москва : Наука, 1982.
6. Штыхаў, Г.В. Крывічы / Г.В. Штыхаў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1992.
7. Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя. — Мінск : Навука і тэхніка, 1985.
8. Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя. — Мінск : БелЭН, 1989.

Праблема паходжання беларускага народа складаная і недастаткова вывучаная. Работа над гэтай тэмай, як і над усімі астатнімі, прадугледжвае глыбокае знаёмства з навуковай літаратурай, супастаўленне розных пунктаў гледжання.

У пачатку работы неабходна раскрыць змест паняццяў «этнічная тэрыторыя», «этнас», іх адзнакі, указаць асноўныя гістарычныя формы этнаса. Калі пачынаецца індаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі?

Кажучы аб крывічах, радзімічах і дрыгавічах, пакажыце элементы ў іх культуры, якія былі характэрны балтам і славянам. Як паўплывалі на развіццё крывічоў, радзімічаў і дрыгавічоў кантакты з іншымі ўсходнеславянскімі плямёнамі, яцьвягамі, літоўцамі, варагамі, Візантыйскай імперыяй, Хазарскім каганатам? Ці былі гэтыя кантакты варожымі, сяброўскімі, узаемавыгаднымі?

Па 4 пытанні раскажыце аб розных пунктах гледжання на паходжанне беларусаў (польская, вялікаруская, балцкая, крывіцкая, крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкая, фінская, старажытнаруская канцэпцыі).

## ТЭМА 3 Старажытныя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі ў IX — першай палове XIII ст.

1. Полацкае княства ў IX–XI стст.
2. Тураўскае княства ў IX–XI стст.
3. Феадальная раздробленасць на беларускіх землях.
4. Барацьба са знешняй агрэсіяй.

### Літаратура


1. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля в IX–XIII вв.: Очерки истории Северной Белоруссии / Л.В. Алексеев. — Москва : Наука, 1966.
2. Арлоў, У. Таямніцы полацкай гісторыі / У. Арлоў. — Мінск : Полымя, 2000.
3. Гісторыя Беларусі : у 6 т. — Т. 1. — Мінск : Экаперспектыва, 2000.
4. Доўнар-Запольскі, М. Гісторыя Беларусі / М. Доўнар-Запольскі. — Мінск : БелЭн, 1994.
5. Загарульскі, Э.М. Заходняя Русь: IX–XIII стст. : вучэбны дапаможнік / Э.М. Загарульскі. — Мінск : Выд-ва БДУ, 1998.
6. Загорульский, Э.М. Генеалогия полоцких князей Изяславичей / Э.М. Загорульский. — Минск : ВУЗ-ЮНИТИ, 1994.

7. Лысенко, П.Ф. Туровская земля IX–XIII вв. / П.Ф. Лысенко. — Минск : Право и экономика, 1999.
8. Тарасаў, С.В. Чарадзей сёмага веку Траяна: Усяслаў Полацкі / С.В. Тарасаў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1991.
9. Филист, Г.М. История «преступлений» Святополка Окаянного / Г.М. Филист. — Минск : Беларусь, 1990.
10. Штыхов, Г.В. Города Полоцкой земли: (IX–XIII вв.) / Г.В. Штыхов. — Минск : Наука и техника, 1978.

Прапанаваная тэма ахоплівае перыяд стварэння першых дзяржаў-княстваў на землях славянскіх этнічных супольнасцяў — крывічоў і дрыгавічоў. Неабходна разгледзець як сам працэс стварэння дзяржаў, так і асаблівасці іх палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця, а таксама раскрыць прычыны іх заняпаду.

У кантрольнай рабоце неабходна асвятліць працэс фарміравання тэрыторыі першых дзяржаў, іх адносіны з Наўгародскай і Кіеўскай Руссю, асаблівасці палітычнага ладу ў Полацкім і Тураўскім княствах. Адкуль прыйшлі першыя князі, якія заснавалі полацкую дынастыю? Хто такія Рагвалод, Рагнеда? Звярніце ўвагу на асобу Усяслава Чарадзея і палітыку, якую ён праводзіў. Асвятліце прычыны, што прывялі да феадальнай раздробленасці ў XII ст., барацьбу супраць нападаў крыжакоў і мангола-татар.

## ТЭМА 4 Сацыяльна-эканамічнае, рэлігійнае і культурнае становішча на беларускіх землях у IX — першай палове XIII ст.

1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у IX–XIII стст.:
   – арганізацыя сістэмы ўлады;
   – фарміраванне феадальных адносін;
   – развіццё гарадоў і рамёстваў.
2. Прынясце хрысціянства.
3. Культура беларускіх зямель у IX–XIII стст.

### Літаратура

1. Арлоў, У. Асветніца з роду Усяслава / У. Арлоў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1989.
2. Арлоў, У. Еўфрасіння Полацкая / У. Арлоў. — Мінск : Маст. літаратура, 1992.
3. Архітэктура Беларусі : энцыкл. даведнік. — Мінск : БелЭН, 1993.

4. Введение христианства на Руси / отв. ред. А.Д. Сухов. — Москва : Мысль, 1987.
5. Гісторыя беларускага мастацтва : Т. 1 — Мінск : Навука і тэхніка, 1987.
6. Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры : Т. 1. — Мінск : Навука і тэхніка, 1987.
7. Мельнікаў, А.А. Кірыл, епіскап Тураўскі. Жыццё. Спадчына. Светапогляд / А.А. Мельнікаў. — Мінск : Беларусь, 1997.
8. Мысліцелі і асветнікі Беларусі : энцыклапедычны даведнік. — Мінск : БелЭн, 1995.
9. Нарысы гісторыі Беларусі : Т. 1. — Мінск : Беларусь, 1994.
10. Христианизация Руси и белорусская культура. — Минск : Наука и техника, 1988.

Стварэнне першых дзяржаў стала магчыма ў выніку развіцця феадальных адносін і стварэння новай сістэмы ўлады. Разгледзьце стан развіцця сельскай гаспадаркі, рамяства і гандлю. Каму ў гэты час належала зямля? На каго абапіраўся князь і калі з'яўляюцца залежныя катэгорыі насельніцтва (назавіце іх). Разгледзьце асаблівасці гарадскога жыцця, развіццё ўнутранага і знешняга гандлю.

Культурнае развіццё беларускіх зямель, іх уцягванне ў сферу ўплыву еўрапейскіх дзяржаў значна паскорылася з прыняццем хрысціянства і распаўсюджваннем сярод пануючых слаёў хрысціянскіх традыцый і культуры, асабліва пісьменнасці, літаратуры, права, мастацтва. Калі і як пранікла хрысціянства на беларускія землі? Выдатныя постаці беларускай культуры таго часу: Кірыла Тураўскі, Еўфрасіння Полацкая, Клемент Смаляціч. Якія на Беларусі склаліся архітэктурныя школы?

## ТЭМА 5 Утварэнне і станаўленне Вялікага княства Літоўскага

1. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага: ад Міндоўга да Віценя.
2. ВКЛ пры Гедыміне, Альгердзе, Вітаўце.
3. Крэўская унія і ўнутрыпалітычнае становішча ў ВКЛ у канцы XIV — першай трэці XV ст.
4. Барацьба з крыжацкай агрэсіяй.

### Літаратура

1. Гуревич, Ф.Д. Древний Новогрудок / Ф.Д. Гуревич. — Ленинград : Наука, 1981.
2. Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі. — Мінск : БелЭН, 1994.
3. Ермаловіч, М.І. Па слядах аднаго міфа. — Мінск : Навука і тэхніка, 1991.

4. Ермаловіч, М.І. Старажытная Беларусь. Полацкі і Навагародскі перыяд. — Мінск : Маст. літаратура, 1990.
5. Ермаловіч, М.І. Старажытная Беларусь. Віленскі перыяд / М.І. Ермаловіч. — Мінск : ВЦ «Бацькаўшчына», 1994.
6. Краўцэвіч, А.К. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага / А.К. Краўцэвіч. — Мінск : Бел. навука, 1998.
7. Насевіч, В. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага. Падзеі і асобы / В. Насевіч. — Мінск : Полымя, 1993.
8. Нарысы гісторыі Беларусі : Ч. 1. — Мінск : Беларусь, 1994.
9. Пашуто, В.Т. Образование Литовского государства / В.Т. Пашуто. — Москва : Изд-во АН СССР, 1959.
10. Пичета, В.И. Белоруссия и Литва в XV–XVI вв. / В.И. Пичета. — Москва : Изд-во АН СССР, 1961.

Дадзеная тэма ахоплівае вялікі храналагічны перыяд. Да разгляду прапаноўваецца некалькі ўзаемазвязаных праблем: утварэнне ВКЛ, унутраная і знешняя палітыка яго першых князёў, уключэнне беларускіх зямель у склад гэтай дзяржавы.

Пры адказе на першае пытанне раскажыце аб палітычнай сітуацыі на беларускіх землях у канцы XII — пачатку XIII ст., аб прычынах феадальных войн у Паўднёва-Заходняй Русі. Асноўную ўвагу звярніце на ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага і ўваходжанне ў яго склад беларускіх зямель. Якія існуюць канцэпцыі па гэтай праблематыцы? Хто з'яўляецца іх аўтарамі і да чаго зводзіцца іх сутнасць?

Дайце характарыстыку ВКЛ пры Міндоўге, Войшалке, Віцене, Гедыміне, Альгердзе. Вызначце прычыны дынастычнай барацьбы 70–90-х гадоў XIV ст., прычыны заключэння Крэўскай уніі (1385 г.).

У выніку Востраўскага пагаднення 1392 г. вялікім князем стаў Вітаўт. Ен праводзіў палітыку цэнтралізацыі і ўзмацнення ўлады вялікага князя, якая ў гэты час дасягнула найбольшай магутнасці. Дакажыце гэта.

Пры адказе на чацвёртае пытанне раскажыце аб барацьбе з іншаземнымі захопнікамі ў часы ўтварэння і станаўлення ВКЛ. «Вялікая вайна» з Тэўтонскім ордэнам 1409–1411 гг. Грунвальдская бітва 1410 г. і яе значэнне.

## ТЭМА 6 ВКЛ у XIV–XVI стст.: сацыяльна-эканамічнае развіццё, дзяржаўна-палітычны лад, культура

1. Асноўныя тэндэнцыі эканамічнага развіцця ў XIV–XVI стст. Аграрная рэформа 1557 г.
2. Развіццё гарадоў у XIV–XVI стст. Магдэбургскае права.
3. Дзяржаўна-палітычны лад ВКЛ:
   – арганізацыя цэнтральнай ўлады. Правы вялікага князя і сейма;
   – асноўныя класы-саслоўі і іх правы;
   – заканадаўчая і судовая сістэма ВКЛ. Статуты ВКЛ.
4. Культура беларускіх зямель у XIV–XVI стст.:
   – Адраджэнне на Беларусі;
   – літаратура і кнігадрукаванне;
   – мастацтва і архітэктура.

### Літаратура


1. Бярозкіна, Н.Ю. Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI — пачатак XX ст.) / Н.Ю. Бярозкіна. — Мінск : Беларуская навука, 2000.
2. Галенчанка, Г.Я. Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар / Г.Я. Галенчанка. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993.
3. Гісторыя сялянства Беларусі : Т. 1. Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. — Мінск : Бел. навука, 1997.
4. Голубеў, В. Вялікая аграрная рэформа XVI ст. / В. Голубеў // Спадчына. — 1993. — № 4.
5. Голубеў, В.Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі: XVI–XVIII стст. / В.Ф. Голубеў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1992.
6. Копысский, З.Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. / З.Ю. Копысский. — Минск : Наука и техника, 1975.
7. Падокшын, С.А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага / С.А. Падокшын. — Мінск : Навука і тэхніка, 1991.
8. Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці. — Мінск : Навука і тэхніка, 1975.
9. Спиридонов, М.Ф. Закрепощение крестьянства Белоруссии (XV–XVI вв.) / М.Ф. Спиридонов. — Минск : Наука и техника, 1993.
10. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. : Тэксты. Давед. Камент. / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелСЭ, 1989.
11. Эканамічная гісторыя Беларусі : курс лекцый. — Мінск, 1993.


У дадзены перыяд ВКЛ знаходзілася на вяршыні свайго эканамічнага і сацыяльнага развіцця. Акрамя асноўных галін вытворчасці працягвала развівацца і ўдасканальвацца сістэма кіравання краінай.

У адказе на першае пытанне трэба разгледзець сістэму землеўладання. Каму належала зямля, якія існавалі падаткі і павіннасці? Чым было выклікана правядзенне зямельнай рэформы? Хто пачаў правядзенне рэформы? Пакажыце асноўныя мерапрыемствы па землеўпарадкаванні. Сутнасць і вынікі аграрнай рэформы ў ВКЛ.

У адказе на другое пытанне прасачыце, якія новыя функцыі пачаў выконваць горад. Якія з'явіліся новыя рамёствы? Як развіваўся гандаль? Сацыяльны склад гарадскога насельніцтва. Якія з'явіліся новыя формы вытворчасці? Што такое цэх? Што такое Магдэбургскае права? Калі гарады Беларусі сталі карыстацца Магдэбургскім правам?

У адказе на трэцяе пытанне разгледзьце, якім чынам была арганізавана цэнтральная ўлада. Як размяркоўвалася ўлада паміж вялікім князем і Соймам? Хто мог прымаць удзел у рабоце Сойма? Хто ўваходзіў у шляхецкае саслоўе? У чым розніца паміж шляхтай і магнатамі? Якімі заканадаўчымі дакументамі было рэгламентавана жыццё ВКЛ? Раскрыйце сутнасць Судзебніка Казіміра; I, II і III Статутаў ВКЛ.

У адказе на чацвёртае пытанне дайце азначэнне паняцця «Адраджэнне» (Рэнесанс). Што для яго характэрна? Якія прыкметы Адраджэння былі ў ВКЛ? У якім стане знаходзілася літаратура? Назавіце вядомых аўтараў і іх творы. Як пачало развівацца кнігадрукаванне ў ВКЛ? Хто быў першым кнігадрукаром? Асвятліце дзейнасць Ф. Скарыны. Пад уплывам чаго развіваліся выяўленчае мастацтва і архітэктура? Назавіце іх асноўныя стылі і жанры.

## ТЭМА 7 Стварэнне Рэчы Паспалітай і яе развіццё ў другой палове XVI — першай палове XVII ст.

1. Люблінская унія і стварэнне Рэчы Паспалітай.
2. ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай. Унутраная і знешняя палітыка ў канцы XVI — пачатку XVII ст.
3. Рэлігійная сітуацыя на беларускіх землях:

– Рэфармацыя, яе ідэалогія і асноўныя накірункі;

– контррэфармацыя і яе праявы;

– Брэсцкая царкоўная унія.

## Літаратура


1. З гісторыі уніяцтва ў Беларусі (да 400-годдзя Брэсцкай уніі). — Мінск : Экаперспектыва, 1996.
2. Из истории свободомыслия и атеизма в Белоруссии. — Минск: Наука и техника, 1978.
3. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII — XX ст.) / В.В. Грыгор’ева [і інш.]. — Мінск : Экаперспектыва, 1998.
4. Лойка, Л.В. Рэспубліка і яе эпоха / Л.В. Лойка // Беларуская мінуўшчына. — 1995. — № 6, 1996. — № 1.
5. Лойка, П. Незалежнасць пасля Любліна, або магнацка-шляхецкая «беларусізацыя» / П. Лойка // Беларусазнаўства : навуч. дапаможнік / пад рэд. П. Брыгадзіна. — Мінск : Завігар, 1997. — С. 54–63.
6. Марозава, С.В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі : вуч. дапаможнік / С.В. Марозава. — Гродна : ГрДУ, 1996.
7. Подокшин, С.А. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы (вторая половина XV — начало XVII в.) / С.А. Подокшин. — Минск : Наука и техника, 1970.
8. Рэлігія і царква на Беларусі : энцыклапедычны даведнік. — Мінск : БелЭн, 2001.
9. Саверчанка, І.В. Сымон Будны — гуманіст і рэфарматар / І.В. Саверчанка. — Мінск : Універсітэцкае, 1993.


Названая тэма ахоплівае перыяд, калі ВКЛ, у выніку падпісання Люблінскай уніі ўвайшло ў склад Рэчы Паспалітай. Нягледзячы на намаганні Польшчы, ВКЛ удавалася на працягу значнага перыяду захоўваць сваю палітычную самастойнасць.

У адказе на першае пытанне неабходна разгледзець прычыны, якія вымусілі ВКЛ падпісаць Люблінскую ўнію і яе ўмовы. Што ўяўляла новае дзяржаўнае ўтварэнне пад назвай Рэчы Паспалітай? Якія правы і прыкметы самастойнай дзяржавы захавала ВКЛ?

У адказе на другое пытанне неабходна звярнуць увагу на палітыку цэнтральнай улады, правядзенне рэформ і прыняцце Статута ВКЛ 1588 г. Пачатак працэсу паланізацыі і акаталічвання Беларусі. Спроба вяртання зямель, страчаных у XVI ст. Роля ВКЛ у справах Маскоўскай дзяржавы ў Смутны час (1602–1610).

У адказе на трэцяе пытанне дайце азначэнне паняццю «Рэфармацыя». Якой была ідэалогія Рэфармацыі? Якія накірункі і плыні Рэфармацыі мелі

месца ў ВКЛ? Назавіце найбольш выбітных прадстаўнікоў Рэфармацыі ў ВКЛ. Якія класы і саслоўі сталі прыхільнікамі Рэфармацыі? Чым была выклікана контррэфармацыя? Разгледзьце дзейнасць ордэна езуітаў у ВКЛ. Якія адукацыйныя ўстановы былі заснаваны езуітамі на землях ВКЛ? Што такое царкоўная унія? Прычыны і падставы для Берасцейскай уніі. Вынікі уніі.

## ТЭМА 8 Беларускія землі ў другой палове XVII — XVIII ст.

1. Войны сярэдзіны XVII ст. і іх наступствы для Беларусі.
2. Крызіс Рэчы Паспалітай і спробы рэформ у дзяржаве.
3. Падзелы Рэчы Паспалітай. Паўстанне Т. Касцюшкі.

### Літаратура


1. Грыцкевіч, В. Два погляды на адну канстытуцыю / В. Грыцкевіч // Полымя. — 1993. — № 9.
2. Грыцкевіч, А.П. Паўстанне 1794 года: перадумовы, ход, вынікі / А.П. Грыцкевіч // Беларускі гістарычны часопіс. — 1994. — № 1.
3. Емяльянчык, У.П. Паланез для касінераў / У.П. Емяльянчык. — Мінск : Беларусь, 1994.
4. Можы, Ю. Дэмаграфічны спад на Беларусі і Літве ў сярэдзіне XVII ст. / Ю. Можы // Спадчына. — 1992. — № 5.
5. Пашкевіч, У. ВКЛ у Паўночнай вайне (1700–1721 гг.) / У. Пашкевіч // Беларускі гістарычны часопіс. — 1995. — № 3.
6. Прыбытка, Г.В. Барацьба магнацкіх груповак у другой палове XVII — пачатку XVIII ст. / Г.В. Прыбытка // Спадчына. — 1995. — № 5; 1996. — № 1.
7. Сагановіч, Г.М. Невядомая вайна 1654–1667 / Г.М. Сагановіч. — Мінск : Навука і тэхніка, 1995.
8. Чудаков, М.Ф. Конституция Речи Посполитой 3 мая 1791 г. / М.Ф. Чудаков. — Минск : Право и экономика, 2005.
9. Юхо, Я.А. За вольнасць нашу і вашу: Тадэвуш Касцюшка / Я.А. Юхо. — Мінск : Навука і тэхніка, 1989.
10. Юхо, Я.А. Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 3-га мая 1791 г. і Беларусь / Я.А. Юхо // Веснік БДУ. Сер. 3. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. — 1996. — № 3. — С. 85–89.


У адказе на першае пытанне неабходна раскрыць прычыны казацкай вайны. Чаму яна разглядаецца як антыфеадальная? Ці былі казакі ў ВКЛ? Пералічыце асноўныя падзеі вайны, назавіце яе вынікі. Наступная вайна адбылася з Маскоўскай дзяржавай і мела незваротныя наступствы для развіцця ВКЛ. Хто ў той перыяд быў рускім царом? Якія былі падставы для вайны? Якую палітыку праводзілі расійскія ўлады на беларускіх тэрыторыях? У якім

стане апынулася эканоміка беларускіх зямель? Падзеі Паўночнай вайны 1700–1721 гг. на беларускіх землях. Ці здолела Рэч Паспалітая пераадолець наступствы войнаў сярэдзіны XVII — пачатку XVIII ст.?

У адказе на другое пытанне прааналізуйце праявы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага крызісу Рэчы Паспалітай у другой палове XVII — XVIII ст. Асвятліце спробы выпраўлення крызіснага становішча. Чаму яны аказаліся няўдалымі?

Разглядаючы I, II і III падзелы Рэчы Паспалітай, вызначце іх прычыны. Якія дзяржавы прынялі ў іх удзел і якія землі адышлі да Расіі? Раскажыце аб рабоце Чатырохгадовага сойма, аб асноўных артыкулах Канстытуцыі 3 мая 1791 г., аб паўстанні Тадэуша Касцюшкі ў Польшчы і на тэрыторыі далучаных да Расійскай імперыі беларуска-літоўскіх земляў. Пералічыце найбліжэйшых паплечнікаў Касцюшкі.

## ТЭМА 9 Культура беларускіх земляў у XVII–XVIII стст.

1. Літаратура і грамадска-палітычная думка.
2. Архітэктура і мастацтва.
3. Музыка і тэатр.
4. Развіццё сістэмы адукацыі і распаўсюджванне навуковых ведаў.

### Літаратура


1. Барока ў беларускай культуры і мастацтве. — Мінск : Навука і тэхніка, 1998.
2. Барышев, Г.И. Театральная культура Белоруссии XVIII в. / Г.И. Барышев. — Минск : Наука и техника, 1992.
3. Бирилло, А.А. Философская и общественная мысль в Белоруссии и Литве в конце XVI — середине XVIII в./ А.А. Бирилло. — Минск : Изд-во БГУ, 1971.
4. Гісторыя беларускага мастацтва. — Т. 2. — Мінск : Навука і тэхніка, 1988.
5. Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. — Т. 1. — Мінск : Навука і тэхніка, 1987.
6. Дадзіёмава, В.У. Гісторыя музычнай культуры Беларусі / В.У. Дадзіёмава. — Мінск : Белар. гуман. адукацыйна-культурны цэнтр, 1994.
7. Дорошевич, Э.К. Философия эпохи Просвещения в Белоруссии / Э.К. Дорошевич. — Минск : Наука и техника, 1971.
8. Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. — Минск : Изд-во АН БССР, 1969.
9. Из истории свободомыслия и атеизма в Белоруссии. — Минск : Наука и техника, 1978.

10. Философская и общественно-политическая мысль Белоруссии и Литвы: дооктябрьский период. — Минск : Наука и техника, 1987.

Беларуская літаратура ў другой палове XVII — XVIII ст. развівалася ў вельмі неспрыяльных умовах узмацнення нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту, паланізацыі вярхоў грамадства, звужэння сферы ўжывання беларускай мовы. Яны стрымлівалі развіццё нацыянальнай літаратуры, якая стала, за рэдкімі выключэннямі, рукапіснай і ананімнай.

Глыбокія якасныя змены адбыліся ў другой палове XVII — XVIII ст. у беларускім выяўленчым мастацтве. На Беларусі ўзмацняецца тэрытарыяльная дыферэнцыяцыя мастацтва, выразна вылучаюцца мясцовыя жывапісныя школы: магілёўская, віцебская, гарадзенская, полацкая.

Унікальнай з’явай беларускага мастацтва другой паловы XVIII ст. былі прыватнаўласніцкія (прыдворныя) тэатры. Магнацкія тэатры на Беларусі ўзніклі на пераломе часоў барока і Асветніцтва. Першы на Беларусі прыватнаўласніцкі тэатр быў заснаваны ў Нясвіжы.

## ТЭМА 10 Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі на мяжы XVIII–XIX стст.

1. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел і мясцовыя органы кіравання на Беларусі пасля далучэння да Расійскай імперыі. Заканадаўства.
2. Змены ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці, гандлю.
3. Сацыяльная палітыка царызму на беларускіх землях.
4. Нацыянальная і рэлігійная палітыка царскага самадзяржаўя.

### Літаратура

1. Анішчанка, Я.К. Беларусь у гады Кацярыны II (1772–1796) / Я.К. Анішчанка. — Мінск : Веды, 1998.
2. Анищенко, Е.К. Черта оседлости (Белорусская синагога в царствование Екатерины II) / Е.К. Анищенко. — Минск : Арти-Фекс, 1998.
3. Ільяшэвіч, М. Расійская палітыка на землях быўшага беларуска-літоўскага гаспадарства за панаванне Кацярыны II і Паўла I (1772–1801) / М. Ільяшэвіч. — Мінск : Адраджэнне, 1992.
4. Луговцова, С.Л. Политика российского самодержавия по отношению к дворянству Белоруссии в конце XVIII — первой половине XIX в. / С.Л. Луговцова. — Минск : БГПУ, 1997.

5. Лютый, А.М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII — первой половине XIX в. / А.М. Лютый. — Минск: Наука и техника, 1987.
6. Люты, А.М. Дваранства Беларусі ў перыяд разлажэння і крызісу феадалізму (канец XVIII — першая палова XIX ст.) / А.М. Люты, Т.М. Туміловіч. — Мінск : БДПУ, 1991.
7. Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя на Беларусі ў канцы XVIII — пачатку XIX ст. : зб. навук. прац. — Мінск : БДПУ, 1995.
8. Смяховіч, М. Узаемаадносіны самадзяржаўя з каталіцкай царквой на Беларусі (1772–1867) / М. Смяховіч // Беларускі гістарычны часопіс. — 1995. — № 1.
9. Эканамічная гісторыя Беларусі : курс лекцый. — Мінск : Экаперспектыва, 1999.
10. Юхо, Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я.А. Юхо. — Мінск : Універсітэцкае, 1992.

Па дадзенай тэме вам неабходна прааналізаваць палітыку самадзяржаўя на беларускіх землях у канцы XVIII — пачатку XIX ст. Разглядаючы першае пытанне, неабходна ўказаць, на якія тэрытарыяльныя адзінкі былі падзелены беларускія землі ў выніку губернскіх рэформ 1796 і 1801 гг., якія меліся асаблівасці адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Беларусі ў параўнанні з цэнтральнымі раёнамі Расійскай імперыі. Калі была ўсталявана мяжа яўрэйскай аседласці, у чым яе сутнасць? Раскажыце аб новай сістэме мясцовага кіравання на Беларусі, што спецыфічнага з’явілася ў сістэме заканадаўства на беларускіх землях у канцы XVIII — пачатку XIX ст.?

Якія змены адбыліся ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці, ва ўнутраным і знешнім гандлі на мяжы XVIII — XIX стст.?

Аналізуючы сацыяльную палітыку царскага ўрада, пакажыце яго адносіны да шляхты, сялян, мяшчан на беларускіх землях. Якія змены адбыліся ў становішчы гэтых сацыяльных пластоў пасля ўключэння беларускіх земляў у склад Расіі?

У апошнім пытанні даследуйце адносіны ўрада Расійскай імперыі да прадстаўнікоў розных этнічных груп, што пражывалі на тэрыторыі Беларусі (беларусы, яўрэі, рускія і інш.). На якой мове існавала сістэма адукацыі на беларускіх землях у пачатку XIX ст.? Аб чым гэта сведчыць? Вызначце пазіцыю кіруючых колаў Расіі да розных рэлігійных канфесій (уніяцкай, праваслаўнай, каталіцкай і інш.).

Якое значэнне мела ўключэнне беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі? Дакажыце свой пункт гледжання.

### ТЭМА 11 Беларусь і расійска-французская вайна 1812 г.

1. Расійска-французскія адносіны і палітычная сітуацыя ў заходніх губернях напярэдадні вайны.
2. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі (лета–восень 1812 г.).
3. Французскі акупацыйны рэжым на беларускіх землях.
4. Вынікі вайны на Беларусі.

### Літаратура

1. Гісторыя Беларусі : вучэбны дапаможнік для ВНУ / пад рэд. А.Г. Каханоўскага, А.А. Яноўскага. — Мінск : Эканомпрэс, 1997.
2. Гісторыя Беларусі : навучальны дапаможнік / А.Г. Каханоўскі [і інш.]. — Мінск : ФУАінфарм, 2001.
3. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. Ч. 2. XIX–XX стст. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. — Мінск : РІВШ БДУ, 2002.
4. Корнейчик, Е. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 г. / Е. Корнейчик. — Минск : Наука и техника, 1962.
5. Ліс, Я. Палітыка Напалеона на Беларусі / Я. Ліс // Спадчына. — 1996. — № 5.
6. Піліпчык, В. 1812 год: Грамадзянская вайна? / В. Піліпчык //ЛіМ. — 1993. — 12 сакавіка.
7. Таляронак, С. Для Беларусі гэта вайна не была айчыннай / С. Таляронак // Звязда. — 1992. — 16 верасня.
8. Тарасаў, К. Беларусы ў напалеонаўскай гвардыі / К. Тарасаў // Звязда. — 1992. — 24 верасня.
9. Троицкий, Н.А. 1812. Великий год России / Н.А. Троицкий. — Москва : Мысль, 1988.
10. Цуба, М. Якой была вайна 1812 г. для Беларусі? / М. Цуба // ЛіМ. — 1991. — 7 чэрвеня.

Адказваючы на першае пытанне, прааналізуйце супярэчнасці, якія пачалі складвацца паміж Расіяй і Францыяй пасля падпісання Тыльзіцкага міру 1807 г., як гэтыя супярэчнасці паўплывалі на палітычнае становішча ў заходніх губернях Расійскай імперыі. Разгледзьце, якія існавалі праекты аднаўлення Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага ў Напалеона і Аляксандра I.

У другім пытанні вызначце характар вайны, яе ўдзельнікаў. Ход ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі неабходна падзяліць на два этапа: першы — лета 1812 г. (наступленне французскіх войск), другі — восень 1812 г. (адступленне з Масквы і разгром французскага войска на Бярэзіне).

Разглядаючы трэцяе пытанне, неабходна прааналізаваць палітыку французскіх акупантаў на Беларусі, сістэму кіравання акупіраванымі землямі (дзейнасць Часовага ўрада ВКЛ, адносіны Напалеона да Генеральнай канфедэрацыі 1812 г.). Вызначце адносіны шляхты беларускіх зямель да вайны, пазіцыю сялянства і прычыны партызанскага руху.

У заключнай частцы работы падвядзіце вынікі вайны 1812 г. для Беларусі: разарэнне краю, страты насельніцтва, узмацненне імперскай рэакцыі пасля Венскага кангрэса.

## ТЭМА 12 Грамадска-палітычны рух на Беларусі ў першай палове XIX ст.

1. Грамадска-палітычны рух у 10–20-я гг. XIX ст.
2. Паўстанне 1830–1831 гг. у Польшчы, Літве і на Беларусі.
3. Змены ў палітыцы самадзяржаўя на Беларусі пасля паўстання 1830–1831 гг.
4. Грамадска-палітычны рух у 40–50-я гг. XIX ст.

### Літаратура


1. Гарбачова, В.В. Паўстанне 1830–1831 гадоў на Беларусі / В.В. Гарбачова. — Мінск : БДУ, 2001.
2. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. Ч. 2. XIX–XX стст. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. — Мінск : РІВШ БДУ, 2002.
3. Смяховіч, М. Арганізацыя і асобы: паўстанне 1830–1831 гг. на Беларусі / М. Смяховіч // Полымя. — 1996. — № 4.
4. Степунин, И.В. В беспокойном краю / И.В. Степунин // Неман. — 1989. — № 6.
5. Таляронак, С. Грамадска-палітычны рух на Беларусі напярэдадні вайны 1812 г. / С. Таляронак // Беларускі гістарычны часопіс. — 1994. — № 3.
6. Таляронак, С. Палітыка царызму ў адносінах да каталіцкай і уніяцкай царквы на Беларусі (1772–1839 гг.) / С. Таляронак // Весці АН Беларусі. Серыя грамад. навук. — 1992. — № 2.
7. Таляронак, С. Тайнае вучнёўскае таварыства «Заране» (20-я гг. XIX ст.) / С. Таляронак // Беларускі гістарычны часопіс. — 1995. — № 3.
8. Таляронак, С. Тайныя таварыствы ў Літве і на Беларусі ў канцы XVIII ст.: Віленская асацыяцыя 1796–1797 гг. / С. Таляронак // Весці АН Беларусі. — 1992. — № 5–6.
9. Швед, В. Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў / В. Швед. — Мінск : БелНДІДАС, 1998.
10. Швед, В. Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863) / В. Швед. — Гродна : ГрГУ, 2001.

Перш за ўсё трэба вызначыць асаблівасці грамадска-палітычнага руху на Беларусі ў канцы XVIII — пачатку XIX ст., якія вынікаюць з паланізацыі сацыяльных вярхоў беларускага грамадства і інтэлігенцыі. Паказаць, што менавіта Віленскі універсітэт з'явіўся цэнтрам польскага апазіцыйнага і рэвалюцыйна-шляхецкага руху (шубраўцы, філаматы, прамяністыя, філарэты і іншыя тайныя гурткі).

Разглядаючы грамадска-палітычны рух у 20-я г. XIX ст. на Беларусі, нельга абмінуць снежаньскія падзеі 1825 г. на Сенацкай плошчы ў Пецярбургу. У сувязі з гэтым неабходна асвяціць наступныя праблемы: дзекабрысты — ураджэнцы Беларусі; дзекабрысцкія арганізацыі на Беларусі; сябры расійскіх дзекабрысцкіх таварыстваў на тэрыторыі Беларусі; адносіны дзекабрыстаў да нацыянальнага пытання; сувязь арганізацый дзекабрыстаў і польскіх тайных таварыстваў.

Адказваючы на другое пытанне, неабходна вызначыць прычыны паўстання 1830–1831 гг., яго праграму, ход баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі і прычыны паражэння паўстанцаў.

Паражэнне паўстання ўзмацніла курс на русіфікацыю і дэпаланізацыю Беларусі. У адказе на трэцяе пытанне неабходна дакладна вызначыць мерапрыемствы царскага ўрада ў гэтай галіне пад час дзейнасці Камітэта па справах Заходніх губерняў.

У адказе на чацвёртае пытаннне высветліце, які ўплыў на палітычныя настроі беларускай шляхты аказалі галіцкія падзеі і «вясна народаў», рэвалюцыі 1848 г.; прасачыце зараджэнне рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні ў грамадска-палітычным руху на Беларусі («Дэмакратычнае таварыства», «Саюз свабодных братоў»).

## ТЭМА 13 Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у першай палове XIX ст.

1. Сельская гаспадарка: памешчыцкае землеўладанне і сялянскае землекарыстанне.

2. Крызіс феадальна-прыгонніцкіх адносін. Эканамічныя рэформы.

3. Прамысловасць. Шляхі зносін. Гандаль.

4. Гарады.

## Літаратура


1. Анішчанка, Я. Дынабургскі праект / Я. Анішчанка // Беларуская мінуўшчына. — 1995. — № 1.
2. Болбас, М.Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795–1861 гг.) / М.Ф. Болбас. — Минск : Наука и техника, 1966.
3. Гісторыя сялянства Беларусі : Т. 1. Ад старажытнасці да 1861 г. — Мінск : Бел. навука, 1997.
4. Лютый, А.М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII — первой половине XIX в. / А.М. Лютый. — Минск : Наука и техника, 1987.
5. Люты, А.М. Дваранства Беларусі ў перыяд разлажэння і крызісу феадалізму (канец XVIII — першая палова XIX ст.) : вучэбна-метадычны дапаможнік / А.М. Люты, Т.М. Туміловіч. — Мінск: БДПУ, 1991.
6. Чепко В.В. Города Белоруссии в первой половине XIX века (Экономическое развитие). — Минск : Изд-во БГУ, 1981.
7. Чепко, В.В. Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в. / В.В. Чепко. — Минск : Наука и техника, 1972.
8. Чепко, В.В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX века / В.В. Чепко. — Минск : Наука и техника, 1966.
9. Эканамічная гісторыя Беларусі. — Мінск : Экаперспектыва, 1999.


Асвятленне першага пытання трэба пачаць з аналізу развіцця памешчыцкай і сялянскай гаспадарак у Беларусі. Неабходна заўважыць, што ў эканоміцы панавалі буйныя феадалы, гаспадарка якіх спалучала ў сабе рысы прыгонніцкага ладу і элементы новых, капіталістычных адносін.

Характарызуючы сялянскую гаспадарку, вызначце павіннасці сялян, умовы землекарыстання, асаблівасці ў становішчы казённых сялян, узровень агракультуры беларускай вёсцы.

Па другім пытанні перш за ўсё разгледзьце, у чым дакладна праявіліся разлажэнне і крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Крызіснае становішча ў сельскай гаспадарцы выклікала неабходнасць яе рэфармавання. Высвятліце асноўныя мэты і мерапрыемствы рэформаў П.Д. Кісялёва. Адзначце станоўчыя і адмоўныя вынікі аграрных рэформаў 40-х — сярэдзіны 50-х гг.

Вядучы размову аб развіцці прамысловасці, назавіце этапы развіцця капіталістычнай вытворчасці і вызначце, якія з іх былі характэрны для пра-

мысловага развіцця беларускіх земель у першай палове XIX ст. Высветліце галіновую структуру беларускай прамысловасці ў гэты час. Пералічыце асноўныя шляхі зносін у першай палове XIX ст. У якім стане яны знаходзіліся? Што было характэрна для развіцця гандлю на Беларусі ў першай палове XIX ст.?

Адказваючы на апошняе пытанне кантрольнай работы, неабходна прааналізаваць наступныя моманты: рост гарадоў і мястэчак; колькасць, саслоўны і нацыянальна-канфесійны склад гарадскога насельніцтва; прымусовае высяленне яўрэяў у гарады і мястэчкі; органы гарадскога самакіраванння.

## ТЭМА 14 Культура Беларусі ў першай палове XIX ст.

1. Нацыянальна-культурная палітыка царызму.
2. Школа і адукацыя. Гістарычныя і этнаграфічныя даследаванні Беларусі.
3. Вусная народная творчасць. Станаўленне новай беларускай літаратуры.
4. Музыка і тэатр.
5. Архітэктура і выяўленчае мастацтва.

### Літаратура


1. Гісторыя беларускага мастацтва. — Мінск : Навука і тэхніка, 1987. — Т. 1; 1988 — Т. 2.
2. Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры : Т. 1.— Мінск : Навука і тэхніка, 1986.
3. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. — Мінск : Экаперспектыва, 1996.
4. Доўнар-Запольскі, М. Гісторыя Беларусі / М. Доўнар-Запольскі. — Мінск : БелЭН, 1994.
5. Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г.А. Каханоўскі. — Мінск : Навука і тэхніка, 1984.
6. Качаноўскі, У.У. Гісторыя культуры Беларусі : вучэбны дапаможнік для студэнтаў ВНУ / У.У. Качаноўскі. — Мінск : Выш. школа, 1994.
7. Мальдзіс, А. Падарожжа ў XIX ст.: З гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры / А. Мальдзіс. — Мінск : Навука і тэхніка, 1969.
8. Мохнач Н.Н. Общественно-политическая и эстетическая мысль Белоруссии начала XIX в. / Н.Н. Мохнач. — Минск : Наука и техника, 1985.
9. Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. — Мінск : Нар. асвета, 1986.
10. Трусаў, А.А. Старонкі мураванай кнігі: Манументальная архітэктура эпохі феадалізму і капіталізму / А.А. Трусаў. — Мінск : Беларусь, 1990.

Адказваючы на першае пытанне, неабходна высветліць адносіны царскага ўрада да прадстаўнікоў розных этнічных супольнасцей, што жылі на тэрыторыі Беларусі (беларусаў, рускіх, яўрэяў, палякаў і інш.). Ці прызнавалі расійскі ўрад і афіцыйная навука існаванне беларускага этнасу? Прааналізуйце дзейнасць Камітэта па справах Заходніх губерняў у нацыянальна-культурнай галіне.

Даючы характарыстыку адукацыі, пакажыце ролю царквы ў яе арганізацыі ў першай палове XIX ст. Ці мела месца тэндэнцыя да пашырэння свецкай адукацыі, у чым гэта выявілася? Якія рэформы ў сістэме адукацыі былі праведзены на тэрыторыі Беларусі ў першай палове XIX ст. і чым яны былі выкліканы? Ці існавала сістэма адукацыі для жанчын? Назавіце найбольш вядомыя навучальныя ўстановы на тэрыторыі Беларусі ў першай палове XIX ст. Чым быў выкліканы інтарэс да навуковага вывучэння Беларусі, якія ўстановы займаліся гэтым у першай палове XIX ст.? Назавіце найбольш вядомыя гістарычныя і этнаграфічныя даследаванні Беларусі.

Адказваючы на трэцяе пытанне, высветліце, якія існавалі жанры вуснай народнай творчасці, якія бакі жыцця народа ў ёй адлюстроўваліся. Вызначце ролю беларускай мовы ў грамадскім жыцці беларускіх зямель першай паловы XIX ст. і прасачыце працэс фарміравання літаратурнай беларускай мовы (рукапісная, ананімная літаратура, творчасць Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, А. Міцкевіча, В. Дуніна-Марцінкевіча).

У адказе на чацвёртае пытанне ахарактарызуйце стан развіцця музычнай культуры і тэатра на Беларусі.

У заключнай частцы работы пакажыце, якія стылі панавалі ў архітэктуры першай паловы XIX ст. Прывядзіце прыклады асноўных архітэктурных помнікаў канца XVIII — першай паловы XIX ст. Пералічыце асноўныя жанры выяўленчага мастацтва і прывядзіце прыклады творчасці найбольш значных мастакоў.

## ТЭМА 15 Станаўленне буржуазнага грамадства на Беларусі

1. Этапы падрыхтоўкі аграрнай рэформы. Маніфест і Палажэнні 19 лютага 1861 г.
2. Асаблівасці правядзення сялянскай рэформы на Беларусі. Змены ў рэалізацыі рэформы пад уплывам сялянскага руху і паўстання 1863 г. Вынікі і значэнне рэформы.
3. Ваенная, земская, судовая, гарадская, цензурная, школьная рэформы. Спецыфіка іх правядзення на Беларусі.

### Літаратура


1. Гісторыя Беларусі : вучэбны дапаможнік для ВНУ / пад рэд. А.Г. Каханоўскага, А.А. Яноўскага. — Мінск : Эканомпрэс, 1997.
2. Гісторыя Беларусі : навучальны дапаможнік / А.Г. Каханоўскі [і інш.]. — Мінск: ФУАінфарм, 2001.
3. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. Ч. 2. XIX–XX стст. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. — Мінск : РІВШ БДУ, 2002.
4. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / пад рэд. Касцюка М.П. [і інш.]. — Ч. 2. — Мінск: Беларусь, 1995.
5. Самбук, С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. / С.М. Самбук. — Минск : Наука и техника, 1980.
6. Улащик, Н.Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии / Н.Н. Улащик. — Москва : Наука, 1965.
7. Шыбека, З. Ад рэформы да рэвалюцыі: (Аб зямельнай рэформе 1861 г. і становішчы ў Беларусі) / З. Шыбека // Голас Радзімы. — 1991. — 18 ліпеня.
8. Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002) / З. Шыбека. — Мінск : Энцыклапедыкс, 2003.
9. Эканамічная гісторыя Беларусі / пад рэд. Галубовіча В.І. — Мінск : Экаперспектыва, 1999.
10. Юхо, Я. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я. Юхо. — Мінск : Універсітэцкае, 1992.


Перш за ўсё трэба паказаць, што да сярэдзіны XIX ст. рэзка абвастрыўся крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы, пералічыць яго праявы, затым паказаць, якія сілы выступалі за правядзенне аграрнай рэформы. Якая роля ў гэтым працэсе адводзілася землеўладальнікам з Беларусі? Асвяціце этапы падрыхтоўкі рэформы і дайце аналіз асноўных дакументаў, па якіх праводзілася рэформа.

Па другім пытанні неабходна высветліць, на аднолькавых умовах праводзілася аграрная рэформа на тэрыторыі Беларусі ці не. Чым гэта было выклікана? Якім чынам падзеі 1863 г. на Беларусі і ў Літве паўплывалі на правядзенне тут аграрнай рэформы? Вызначце прагрэсіўныя наступствы рэформы 1861 г. Ці меліся адмоўныя вынікі рэформы?

У адказе на трэцяе пытанне асноўную ўвагу неабходна звярнуць на асаблівасці буржуазных рэформ другой паловы XIX ст. на Беларусі. Чым яны былі выкліканы? Чаму на беларускіх землях была адкладзена земская рэформа?

## ТЭМА 16 Развіццё капіталізму на Беларусі ў другой палове XIX ст.

1. Сельская гаспадарка ва ўмовах перабудовы на капіталістычны лад.
2. Прамысловая рэвалюцыя. Транспарт і гандаль.
3. Фарміраванне сацыяльнай структуры буржуазнага грамадства.

### Літаратура

1. Абезгауз, З.Е. Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX века / З.Е. Абезгауз. — Минск : Наука и техника, 1971.
2. Біч, М.В. Нацыянальны склад прамысловага пралетарыяту Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. / М.В. Біч // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. — 1972. — № 4.
3. Болбас, М.Ф. Промышленность Белоруссии: 1860–1900 / М.Ф. Болбас. — Минск : Изд-во БГУ, 1978.
4. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён : у 3 т. Т. 2: Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. — Мінск : Бел. навука, 2002.
5. История рабочего класса Белорусской ССР : Т. 1. Рабочий класс Белоруссии в период капитализма. — Минск : Наука и техника, 1984.
6. Липинский, Л.П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (вторая половина XIX в.) / Л.П. Липинский. — Минск : Наука и техника, 1971.
7. Панютич, В.П. Из истории формирования пролетариата Белоруссии 1861–1914 / В.П. Панютич. — Минск : Наука и техника, 1969.
8. Панютич, В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. / В.П. Панютич. — Минск : Наука и техника, 1990.
9. Шыбека, З. Сацыяльнае размежаванне беларусаў у канцы XIX ст. / З. Шыбека // Весці АН БССР. Серыя грамад. навук. — 1991. — № 6.

Рэформа 1861 г. адкрыла шлях да паскоранага развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, але пераход да новай сістэмы адбываўся марудна. Высветліце прычыны гэтага. Што такое пераходная сістэма гаспадарання? Дай-

це характарыстыку памешчыцкай і сялянскай гаспадаркам у парэформенны перыяд. Якія рысы буржуазнага ладу і капіталістычных адносін можна вызеліць у сельскай гаспадарцы Беларусі другой паловы XIX ст.? Якія вынікі для развіцця сельскай гаспадаркі беларускіх зямель меў аграрны крызіс 80-х гг. XIX ст.?

Разглядаючы развіццё прамысловасці, назавіце этапы развіцця капіталістычнай вытворчасці і вызначце, якія з іх былі характэрны для прамысловага развіцця беларускіх зямель у другой палове XIX ст. Высветліце асаблівасці галіновай структуры беларускай прамысловасці і яе размяшчэнне. Пакажыце асаблівасці прамысловай рэвалюцыі на Беларусі. Пералічыце буйныя прамысловыя прадпрыемствы.

Па трэцім пытанні неабходна прасачыць, як ажыццяўленне буржуазных рэформ паўплывала на змены ў сацыяльнай структуры грамадства. Як адбывалася фарміраванне пралетарыята і буржуазіі на беларускіх землях. Пакажыце спецыфіку гэтых працэсаў. Як змяняецца сацыяльная структура гарадоў і мястэчак?

## ТЭМА 17 Паўстанне 1863–1864 гг. на Беларусі

1. Рэвалюцыйныя дэмакраты Расіі і польска-беларуска-літоўскі вызваленчы рух: сацыяльная база і праграмныя ўстаноўкі.
2. К. Каліноўскі: палітычныя погляды і рэвалюцыйная дзейнасць.
3. Дзейнасць паўстанцкіх атрадаў на тэрыторыі Беларусі.
4. Меры царскай адміністрацыі па падаўленні паўстання. Значэнне паўстання 1863–1864 гг. на Беларусі.

### Літаратура

1. Біч, М. Каліноўскі і паўстанне 1863 г. у працах беларускіх савецкіх гісторыкаў / М. Біч // Весці АН БССР. Серыя грам. навук. — 1989. — № 3.
2. Біч, М. Нацыянальнае і аграрнае пытанне ў час паўстання 1863–1864 гг. / М. Біч // Беларускі гістарычны часопіс. — 1993. — № 3.
3. Да 130-годдзя паўстання ў Польшчы, Беларусі і Літве // Беларускі гістарычны часопіс. — 1994. — № 3.

4. Кісялёў, Г. Каліноўскі знаёмы і незнаёмы / Г. Кісялёў // Полымя. — 1993. — № 6.
5. Кісялёў, Г. На пераломе дзвюх эпох: Паўстанне 1863 г. на Міншчыне / Г. Кісялёў. — Мінск : Полымя, 1990.
6. Майхрович, А.С. Белорусские революционные демократы: Важнейшие аспекты мировоззрения / А.С. Майхрович. — Минск : Наука и техника, 1977.
7. Таляронак, С. Той самы Мураўёў: Генерал-карнік і паўстанне 1863 г. на Беларусі і Літве / С. Таляронак // Настаўніцкая газета. — 1991. — 9, 16, 20, 27 лютага, 2, 20 сакавіка.
8. Шалькевіч, В.Ф. Каліноўскі: Канстанцін, Кастусь ці Вікенцій / В.Ф. Шалькевіч // Беларуская мінуўшчына. — 1994. — № 4.
9. Шалькевич, В.Ф. Кастусь Калиновский: страницы биографии / В.Ф. Шалькевич. — Минск : Университетское, 1988.

Адказваючы на першае пытанне, неабходна высветліць, хто такія рэвалюцыйныя дэмакраты, ці меліся сувязі паміж рускай рэвалюцыйнай дэмакратыяй і польска-беларускім вызваленчым рухам. Вызначце прычыны і характар паўстання, яго сацыяльную базу і мэты. Варшаўскі цэнтральны нацыянальны і Літоўскі правінцыяльны камітэты.

У адказе на другое пытанне неабходна падрабязна асвятліць жыццёвы шлях і дзейнасць К. Каліноўскага і яго паплечнікаў па літоўскім правінцыяльным камітэце. Прааналізуйце тэкст «Мужыцкай праўды».

Як пачалося паўстанне ў Польшчы, а потым і на Беларусі? Чаму адбыўся контррэвалюцыйны пераварот у Вільні? Партызанская барацьба паўстанцаў. Якімі былі асаблівасці паўстання ва Усходняй і Заходняй Беларусі?

Пакажыце рэакцыю розных колаў расійскага грамадства на паўстанне. М.М. Мураўёў і яго дзейнасць на беларускіх землях. Вызначце прычыны паражэння паўстання. Удзяліце ўвагу «Лістам з-пад шыбеніцы» К. Каліноўскага. Як змянілася палітыка царызму ў адносінах да Беларусі пасля падаўлення паўстання? Вынікі і значэнне паўстання 1863–1864 гг.

## ТЭМА 18 Сацыяльная барацьба на Беларусі ў другой палове XIX ст.

1. Сялянскі рух на Беларусі ў другой палове 60-х — 90-х гг.: дынаміка і формы барацьбы.
2. Народніцтва на Беларусі ў 70–90-я гады.
3. Рабочы рух. Зараджэнне сацыял-дэмакратычнага руху на Беларусі.

### Літаратура


1. Бич, М.О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861–1904 гг. / М.О. Бич. — Минск : Наука и техника, 1983.
2. Бич, М.О. Развитие социал-демократического движения в Белоруссии в 1883–1903 гг. / / М.О. Бич. — Минск : Наука и техника, 1973.
3. Гісторыя Беларусі : вучэбны дапаможнік для ВНУ / пад рэд. А.Г. Каханоўскага, А.А. Яноўскага. — Мінск : Экономпрэс, 1997.
4. Гісторыя Беларусі : навучальны дапаможнік / А.Г. Каханоўскі [і інш.]. — Мінск: ФУАінфарм, 2001.
5. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. Ч. 2. XIX–XX стст. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. — Мінск : РІВШ БДУ, 2002.
6. Крук, У.П. Сялянскі рух на Беларусі, 1864–1900 гг. / У.П. Крук — Мінск : Навука і тэхніка, 1993.
7. Самбук, С.М. Революционные народники Белоруссии / С.М. Самбук. — Минск : Наука и техника, 1972.
8. Самбук, С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. / С.М. Самбук. — Минск : Наука и техника, 1980.
9. Солошенко, В.Н. От народничества к марксизму / Солошенко В.Н. — Минск: Наука и техника, 1971.


Адказ на першае пытанне трэба пачаць з характарыстыкі становішча сялян у другой палове XIX ст., затым прааналізаваць формы сялянскай барацьбы ў 60–70-х гг. і ўзмацненне сялянскага руху ў 80-х гг. Перасяленчы рух.

Адказваючы на другое пытанне, неабходна вызначыць вытокі і сутнасць народніцкага руху. Назавіце народніцкія гурткі 70-х гг. і асвятліце іх дзейнасць. Раскажыце аб выхадцах з Беларусі ў народніцкіх аргнізацыях Расіі (І. Грынявіцкі, С. Кавалік, Р. Ісаеў, А. Бонч-Асмалоўскі, М. Судзілоўскі). Прааналізуйце дзейнасць народніцкіх арганізацый на Беларусі ў першай палове 80-х гг. Група «Гоман» і яе роля ў беларускім нацыянальным руху.

У адказе на трэцяе пытанне ахарактарызуйце становішча рабочага класа Беларусі, пакажыце эвалюцыю рабочага руху ў 60–90-я гг. Як адбыва-

лася распаўсюджванне ідэй марксізму? Першыя сацыял-дэмакратычныя гурткі. Як ішоў працэс афармлення сацыял-дэмакратычных арганізацый у Беларусі? Першы з'езд РСДРП.

## ТЭМА 19 Фарміраванне беларускай нацыі

1. Асноўныя прыкметы этнасу. Перадумовы ператварэння народнасці ў нацыю.
2. Гістарычныя ўмовы кансалідацыі беларускага этнасу ў нацыю.
3. Прыкметы нацыянальнай кансалідацыі беларусаў.

### Літаратура


1. Бич, М.О. Развитие социал-демократического движения в Белоруссии в 1883–1903 гг. / М.О. Бич. — Минск : Наука и техника, 1973.
2. Гринблат, М.Я. Белорусы: Очерки происхождения и этнической истории / М.Я. Гринблат. — Минск : Наука и техника, 1968.
3. Доўнар-Запольскі, М. Гісторыя Беларусі / М. Доўнар-Запольскі. — Мінск : БелЭН, 1994.
4. История рабочего класса БССР. — Т.1. — Минск : Наука и техника, 1984.
5. Лыч, Л.М. Беларуская нацыя і мова / Л.М. Лыч. — Мінск : Маст. літаратура, 1994.
6. Пилипенко, М.Ф. Этнография Белоруссии / М.Ф. Пилипенко. — Минск : Выш. школа, 1981.
7. Пичета, В.Н. Белорусский язык как фактор национальной культуры / В.Н. Пичета. — Минск : Наука и техника, 1991.
8. Беларусазнаўства. Беларуская мова. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 1. — Мінск : БелЭН, 1993.
9. Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя / В.К. Бандарчык [і інш.]. — Мінск : Навука і тэхніка, 1985.
10. Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя. — Мінск : БелСЭ, 1989.


Адказваючы на першае пытанне, перш за ўсё трэба высветліць, што такое этнас, этнічная гісторыя, асноўныя прыкметы этнасу. Высветліце, праз якія этнасацыяльныя формы праходзіць у сваім этнічным развіцці кожны народ, пад уплывам якіх фактараў адбываецца змена адной этнасацыяльнай формы на іншую. Зыходзячы з гэтага, пералічыце асноўныя агульныя перадумовы пераўтварэння народнасці ў нацыю.

Па другім пытанні неабходна вызначыць адмоўныя і станоўчыя вынікі далучэння Беларусі да Расійскай імперыі. Разгледзьце эканамічныя ўмовы кансалідацыі: развіццё капіталістычных таварных адносін, складванне ўнутранага рынку; змены ў сацыяльнай структуры і яе асаблівасці

(колькасць, рассяленне і заняткі беларусаў у другой палове XIX ст., іх саслоўна-класавая структура). Што тычыцца палітычных умоў, то тут трэба прааналізаваць палітыку царызму на Беларусі па нацыянальным пытанні і змены ў ёй пасля 1831 і 1863 гадоў.

Па трэцім пытанні трэба даказаць, што ў беларусаў у канцы XIX — пачатку XX ст. меліся прыкметы нацыянальнай кансалідацыі: фарміраванне нацыянальнай інтэлігенцыі і нацыянальна-вызваленчы рух; фарміраванне беларускай прафесійнай мастацкай культуры (выдавецкая справа, літаратура, драматургія, тэатр, выяўленчае мастацтва і г. д.); распаўсюджанне беларускай літаратурнай мовы; абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. На падставе гэтага зрабіце выснову аб ступені кансалідацыі беларусаў у нацыю.

## ТЭМА 20 Рэвалюцыя 1905–1907 гг. на Беларусі

1. Абвастрэнне сацыяльных і нацыянальных супярэчнасцей у канцы XIX — пачатку XX ст.
2. Вызваленчы рух у перыяд наступлення рэвалюцыі.
3. Адступленне рэвалюцыі. Дэпутаты Беларусі ў I і II Дзяржаўных думах.
4. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг.

### Літаратура


1. Анішчанка, Я. Падмуркі паліцэйскага сацыялізму / Я. Анішчанка // Спадчына. — 1997. — № 3.
2. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. / пад рэд. Новіка Я.К., Марцуля Г.С. — Мінск : Выш. школа, 2006.
3. Гісторыя Беларусі : вучэбны дапаможнік для ВНУ / пад рэд. А.Г. Каханоўскага, А.А. Яноўскага. — Мінск: Эканомпрэс, 1997.
4. Гісторыя Беларусі : навучальны дапаможнік / А.Г. Каханоўскі [і інш.]. — Мінск : ФУАінфарм, 2001.
5. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. Ч. 2. XIX–XX стст. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. — Мінск : РІВШ БДУ, 2002.
6. Чигринов, П.Г. История Беларуси с древности до наших дней : учеб. пособие / П.Г. Чигринов. — Минск : Книжный дом, 2004.
7. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / пад рэд. Касцюка М.П. [і інш.]. — Ч. 2. — Мінск : Беларусь, 1995.

8. Турук, Ф. Белорусское движение: Очерк истории национального и революционного движения белорусов / Ф. Турук. — Минск : Беларусь, 1994.
9. Цуба, М. Беларускі нацыянальны рух на пачатку XX ст. / М. Цуба // Беларускі гістарычны часопіс. — 1996. —№ 1.
10. Шыбека, З. Гісторыя Беларусі ў XIX–XX стст. / З. Шыбека // Голас Радзімы. — 1994. — Кастрычнік, лістапад.

Адказ на першае пытанне трэба пачаць з высвятлення прычын абвастрэння сацыяльных супярэчнасцей і нацыянальнага пытання ў канцы XIX — пачатку XX ст. Далей неабходна даць характарыстыку падзеям і з'явам грамадска-палітычнага жыцця на Беларусі ў пачатку XX ст.: «паліцэйскага сацыялізму», сіяніскага руху, сацыял-дэмакратычным арганізацыям, іх плыням — бальшавізму і меншавізму, арганізацыі партыі эсэраў і «Польскай партыі сацыялістычнай на Літве».

У другім пытанні неабходна звярнуць увагу на студзеньскі рух салідарнасці рабочых Беларусі з рабочымі Пецярбурга і вяснова-летні ўздым палітычных выступленняў і эканамічнай барацьбы рабочых, сялян і салдат. Вызначце адносіны палітычных партый і арганізацый да ўказу аб скліканні Булыгінскай думы. Асвяціце падзеі кастрычніцкай палітычнай стачкі на Беларусі, Маніфест 17 кастрычніка, Курлоўскі расстрэл у Мінску. Як яны паўплывалі на дыферэнцыяцыю грамадска-палітычных сіл? Які водгук на Беларусі мела снежаньскае ўзброенае паўстанне ў Маскве?

Далей неабходна прасачыць, як праходзіў спад рэвалюцыйных настрояў. Чым гэта можна растлумачыць? Прааналізуйце працэс выбараў у першую Дзяржаўную Думу. Якую тактыку выкарысталі партыі левага блоку? Колькі дэпутатаў было абрана ад беларускіх зямель? Звярніце ўвагу на іх партыйную і нацыянальную прыналежнасць. Якія пытанні разглядаліся ў І Дзяржаўнай Думе? Аналагічна апішыце выбары ў ІІ Дзяржаўную Думу і яе работу.

Адказваючы на апошняе пытанне, дайце характарыстыку беларускаму нацыянальнаму руху ў перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг. БСГ, яе праграма і дзейнасць. Газеты «Наша Доля», «Наша Ніва»

## ТЭМА 21 Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча на Беларусі ў 1907–1913 гг.

1. Прамысловае развіццё беларускіх зямель.
2. Сталыпінская аграрная рэформа.
3. Беларусь у трэцячэрвеньскай палітычнай сістэме.

### Літаратура


1. Аврех, А.Я. Столыпин и Третья Дума / А.Я. Аврех. — Москва : Наука, 1968.
2. Дубровский, С.М. Столыпинская аграрная реформа / С.М. Дубровский. — Москва : Наука, 1963.
3. Забаўскі, М.М. Грамадска-палітычная барацьба ў сувязі з увядзеннем земства ў Беларусі / М.М. Забаўскі // Весці АН БССР. — Серыя грам. навук. — 1987. — № 1.
4. Забаўскі М.М. Прадстаўніцтва ад Беларусі ў Дзяржаўнай Думе Расіі (1906–1917 гг.) / М.М. Забаўскі, У.С. Пуцік. — Мінск : БДПУ, 1998.
5. Забаўскі, М.М. Расійская Дзяржаўная Дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906–1917 гг.) /. М.М.Забаўскі. — Мінск : БДПУ, 1999.
6. Липинский, Л.П. Классовая борьба в белорусской деревне, 1907–1914 / Л.П. Липинский. — Минск: Изд-во БГУ, 1981.
7. Липинский, Л.П. Крестьянское и солдатское движение в Белоруссии (1900–1907 гг.) / Л.П. Липинский. — Минск : Наука и техника, 1968.
8. Липинский, Л.П. Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии / Л.П. Липинский. — Минск : Изд-во БГУ, 1978.
9. Слобожанин, В.П. Земское управление в Белоруссии / В.П. Слобожанин. — Минск : Право и экономика, 1994.
10. Шабуня, К.И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905–1907 гг. / К.И. Шабуня. — Минск : Наука и техника, 1962.


Эканоміка Беларусі была складовай часткай эканомікі Расіі, для яе былі характэрны агульнарасійскія працэсы і з’явы: крызіс і дэпрэсія 1900–1908 гг., прамысловы ўздым з 1908 г. Але пры гэтым былі і асаблівасці, якія неабходна вызначыць. Пакажыце, якія новыя рысы ў развіцці прамысловасці Беларусі з’явіліся на пачатку XX ст.: канцэнтрацыя вытворчасці, рост акцыянернага капіталу, манапольныя аб’яднанні, замежныя інвестыцыі. Далейшая спецыялізацыя прамысловасці, яе асаблівасці на Беларусі.

Адказваючы на другое пытанне, ахарактарызуйце становішча ў сельскай гаспадарцы на Беларусі, стан дваранскага і сялянскага землеўладання. Вызначце мэты сталыпінскай аграрнай рэформы і асноўныя яе накірункі. Дасле-

дуйце вынікі і значэнне рэформы. Далейшая спецыялізацыя сельскай гаспадаркі і рост вытворчасці. Узмацненне сацыяльнай дыферэнцыяцыі сялянства.

Адказваючы на апошняе пытанне, прааналізуйце Выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г., высветліце яго асаблівасці на Беларусі. Даследуйце працу III Дзяржаўнай Думы і дэпутатаў ад заходніх губерняў у ёй. Пакажыце расстаноўку палітычных сіл ва ўмовах трэцячэрвеньскай палітычнай сістэмы: аслабленне рэвалюцыйных партый, спецыфіку ліберальнага руху на Беларусі, пазіцыі ўрадавых партый і арганізацый. Абвастрэнне вялікадзяржаўнага расійскага і польскага шавінізму, барацьба з беларускім адраджэнцкім рухам. Земская рэформа на Беларусі, увядзенне і роля земстваў. Вызначце формы і дынаміку рабочага і сялянскага руху.

## ТЭМА 22 Беларусь у гады Першай сусветнай вайны

1. Пачатак і прычыны Першай сусветнай вайны.
2. Эканамічнае і палітычнае становішча беларускіх зямель.
3. Беларускі нацыянальны рух.

## Літаратура


1. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. / пад рэд. Новіка Я.К., Марцуля Г.С. — Мінск : Выш. школа, 2006.
2. Гісторыя Беларусі : вучэбны дапаможнік для ВНУ / пад рэд. А.Г. Каханоўскага, А.А. Яноўскага. — Мінск : Экономпрэс, 1997.
3. Гісторыя Беларусі : навучальны дапаможнік / А.Г. Каханоўскі [і інш.]. — Мінск : ФУАінфарм, 2001.
4. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. Ч. 2. XIX–XX стст. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. — Мінск : РІВШ БДУ, 2002.
5. Мікалаевіч, А. Бежанцы Першай сусветнай вайны / А. Мікалаевіч // Спадчына. — 1994. — №3.
6. Сидоревич, А. Антон Луцкевич. Главы из книги / А. Сидоревич // Неман. — 1990. — № 7.
7. Сидоревич, А. Экскурс в историю, необходимый для восстановления правды об одном человеке — писателе и ученом. В. Ластовский / А. Сидоревич // Неман. — 1998. — № 9.
8. Смальянінаў, М. Трагедыя пачатку XX ст. / М. Смальянінаў // Беларускі гістарычны часопіс. — 1994. — № 3.
9. Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002) / З. Шыбека. — Мінск : Энцыклапедыкс, 2003.

Адказваючы на першае пытанне, высветліце прычыны і характар Першай сусветнай вайны, назавіце яе ўдзельнікаў. Прааналізуйце пачатак і ход ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі. На якой лініі стабілізаваўся фронт у кастрычніку 1915 г.? Звярніце ўвагу на адносіны да вайны буржуазна-ліберальных і сацыялістычных партый.

Разглядаючы другое пытанне, пакажыце, якія змены адбыліся ў палітычным і эканамічным жыцці беларускіх зямель ва ўмовах набліжэння фронту. Што такое мілітарызацыя прамысловасці і транспарту, ваенныя павіннасці? Вызначце спецыфіку рабочага і сялянскага руху ў прыфрантавых умовах. Што сведчыць аб пачатку разлажэння арміі ў 1915–1916 гг.?

У трэцім пытанні высветліце, якія склаліся ўмовы для развіцця беларускага руху ва ўсходняй частцы Беларусі і на беларускіх землях, акупіраваных нямецкімі войскамі. Прааналізуйце палітыку акупацыйных улад у дачыненні да беларускага пытання. Назавіце найбольш актыўных дзеячаў беларускага руху.

## ТЭМА 23 Беларусь на пераломе эпох: люты–снежань 1917 г.

1. Перамога Лютаўскай рэвалюцыі. Двоеўладдзе.
2. Радыкалізацыя мас ва ўмовах трох палітычных крызісаў у Расіі. Канец двоеўладдзя.
3. Барацьба з карнілаўшчынай. Падрыхтоўка і правядзенне бальшавікамі ўзброенага паўстання ў Петраградзе.
4. Усталяванне Савецкай улады на Беларусі. Першыя палітычныя і сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні.

### Літаратура


1. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. / пад рэд. Новіка Я.К., Марцуля Г.С. — Мінск : Выш. школа, 2006.
2. Гісторыя Беларусі : вучэбны дапаможнік для ВНУ / пад рэд. А.Г. Каханоўскага, А.А. Яноўскага. — Мінск : Эканомпрэс, 1997.
3. Гісторыя Беларусі : навучальны дапаможнік / А.Г. Каханоўскі [і інш.]. — Мінск : ФУАінфарм, 2001.
4. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. Ч. 2. XIX–XX стст. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. — Мінск : РІВШ БДУ, 2002.

5. Ігнаценка, І.М. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі: Асаблівасці і вынікі / І.М. Ігнаценка. — Мінск : БелНДЦДААС, 1995.
6. Игнатенко, И.М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии / И.М. Игнатенко. — Минск : Наука и техника, 1992.
7. Игнатенко, И.М. Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии / И.М. Игнатенко. — Минск : Наука и техника, 1986.
8. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / пад рэд. Касцюка М.П. [і інш.]. — Ч. 2. — Мінск : Беларусь, 1995.
9. Савицкий, Э.М. Революционное движение в Белоруссии (август 1914 — февраль 1917 гг.) / Э.М. Савицкий. — Минск : Наука и техника, 1981.
10. Сташкевич, Н.С. Приговор революции: Крушение антисоветского движения в Белоруссии (1917–1925 гг.) / Н.С. Сташкевич. — Минск : Университетское, 1985.

Перш за ўсе трэба вызначыць, якія змены ўнесла Лютаўская рэвалюцыя ў палітычную сістэму Расійскай імперыі, якія новыя органы ўлады былі створаны, як адбываўся гэты працэс на Беларусі. Вызначце сутнасць двоеўладдзя і асаблівасці палітычнага становішча на Беларусі вясной 1917 г.

Адказваючы на другое пытанне, пералічыце крызісы Часовага ўрада, іх прычыны і вынікі. Пералічыце формы рабочага і сялянскага руху на Беларусі, у чым выявіўся рэвалюцыйны рух у войску. Вызначце адносіны палітычных партый і арганізацый на Беларусі да бягучага моманту. Калі скончыўся перыяд двоеўладдзя?

У адказе на трэцяе пытанне неабходна разгледзець сутнасць карнілаўшчыны. Якія сілы былі зацікаўлены ў арганізацыі выступлення Л.Г. Карнілава? Якія сілы на Беларусі выступілі супраць карнілаўшчыны? Ці мела месца на Беларусі «бальшавізацыя Саветаў»? Прааналізуйце працэс змены ўлады ў краіне 25 кастрычніка 1917 г. Якія новыя органы кіравання краінай былі створаны?

У апошняй частцы кантрольнай работы неабходна даследаваць наступныя падзеі: стварэнне ВРК Заходняй вобласці і фронту; усталяванне Савецкай улады ў Мінску, Віцебску, Гомелі, Оршы і іншых гарадах; ліквідацыю Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў Магілёве; утварэнне Аблвыканкамзаха і СНК Заходняй вобласці і фронту; вынікі выбараў ва Устаноўчы сход на Беларусі; мерапрыемствы Савецкай улады ў галіне прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

## ТЭМА 24 Барацьба за стварэнне беларускай дзяржаўнасці (1917–1918 гг.)

1. Беларускі нацыянальны рух і барацьба за вырашэнне нацыянальнага пытання (сакавік–кастрычнік 1917 г.).
2. I Усебеларускі з'езд.
3. Абвяшчэнне БНР і яе роля ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці.

### Літаратура


1. Баргановіч, А. Праблемы нацыянальнай дзяржаўнасці: БНР, 1917–18 гг. / А. Баргановіч // Беларуская думка. — 1996. — № 7.
2. Варонка, Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 г. / Я. Варонка. — Мінск : Беларусь, 1991.
3. Езавітаў, К. Першы Усебеларускі кангрэс / К. Езавітаў // Згода. — 1992. — № 1–2.
4. Игнатенко, И.М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии / И.М. Игнатенко. — Минск : Наука и техника, 1992.
5. Круталевич, В.А. История Беларуси: становление национальной державности (1917–1922 гг.) / В.А. Круталевич. — Минск : Право и экономика, 1999.
6. Круталевич, В.А. На путях самоопределения: БНР–БССР–РБ / В.А. Круталевич. — Минск : Право и экономика, 1995.
7. Ладысеў, У.Ф. На пераломе эпох: станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917–1920 гг.) / У.Ф. Ладысеў, П.І. Брыгадзін. — Мінск : БДУ, 1999.
8. Луцкевіч, А. Дзённік / А. Луцкевіч // Полымя. — 1991. — № 4.
9. Рудовіч, С.С. Пошукі шляхоў да беларускай дзяржаўнасці / С.С. Рудовіч // Беларускі гістарычны часопіс. — 1995. — № 4.
10. Юхо, Я. Беларускія ўрады 1918 г. і іх паўнамоцтвы / Я. Юхо // Беларускі гістарычны часопіс. — 1993. — № 4.


Адказваючы на першае пытанне, неабходна разгледзець наступныя падзеі: арганізацыйная канферэнцыя БСГ 25 сакавіка 1917 г., першы з'езд беларускіх партый і арганізацый і стварэнне БНК; другі з'езд беларускіх партый і арганізацый і стварэнне ЦР; першая сесія ЦР беларускіх партый і арганізацый; другая сесія ЦР беларускіх арганізацый і утварэнне ВБР; стварэнне ЦБВР. Высветліце пазіцыю беларускіх арганізацый па наступных пытаннях: адносіны да Часовага ўрада, да вайны, да вырашэння аграрнага пытання, да беларускай дзяржаўнасці. Выдзеліце поспехі і пралікі.

Па другім пытанні высветліце адносіны беларускіх арганізацый да кастрычніцкіх падзей у Петраградзе. Якія сілы вялі барацьбу за скліканне I Усебеларускага з'езда? Выдзеліце галоўнае пытанне, якое разглядалася

на I Усебеларускім з'ездзе, партыйны і сацыяльна-класавы склад яго ўдзельнікаў і іх рашэнні. Вынікі разгону Усебеларускага з'езда для далейшых падзей барацьбы за стварэнне нацыянальнай дзяржаўнасці.

Па трэцім пытанні неабходна закрануць мірныя перамовы Савецкай Расіі і Германіі ў Брэсце і захоп немцамі новых тэрыторый на Беларусі; прааналізаваць дзейнасць Выканкама Усебеларускага з'езда і віленскіх беларускіх арганізацый, выданне першай, другой і трэцяй Устаўных грамат; разгледзець дзейнасць Рады і Народнага Сакратарыята БНР, іх узаемаадносіны з германскімі ўладамі, краінамі Антанты і Савецкай Расіяй. Чым быў выкліканы палітычны крызіс Рады БНР у маі 1918 г.? Вызначце гістарычную ролю БНР.

## ТЭМА 25 Беларусь у перыяд польскай інтэрвенцыі і Грамадзянскай вайны 1919–1920 гг.

1. Савецка-польская вайна. Захоп тэрыторыі Беларусі войскамі Польшчы.
2. Барацьба беларускага народа супраць польскіх інтэрвентаў.
3. Беларускі нацыянальны рух.

### Літаратура


1. Брыгадзін, П. Рада БНР пасля Рыжскага дагавора 1921 г., ці Канец нацыянальнага рамантызму / П. Брыгадзін, У. Ладысеў // Беларускі гістарычны часопіс. — 1997. — № 1.
2. Грыцкевіч, А. Заканчэнне савецка-польскай вайны ў другой палове 1920 г. і постаць генерала Булах-Булаховіча / А. Грыцкевіч // Спадчына. — 1995. — № 5.
3. Иностранная военная интервенция в Белоруссии, 1917–1920 гг. — Минск : Наука и техника, 1990.
4. Круталевич, В.А. История Беларуси: становление национальной державности (1917–1922 гг.) / В.А. Круталевич. — Минск : Право и экономика, 1999.
5. Круталевіч, В. Рыжскі мірны дагавор / В. Круталевіч // Спадчына. — 1990. — № 1.
6. Луцкевіч, А. Польская акупацыя ў Беларусі / А. Луцкевіч. — Мінск : Навука і тэхніка, 1992.
7. Ладысеў, У.Ф. На пераломе эпох: станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917–1920 гг.) / У.Ф. Ладысеў, П.І. Брыгадзін. — Мінск : БДУ, 1999.
8. Михутина, И.В. Польско-советская война 1919–1920 гг. / И.В. Михутина — Москва : ИСБ РАН, 1994.
9. Сафонаў, М.В. Польская інтэрвенцыя ў Беларусі ў 1919 г. і яе сувязь з міжнародным імперыялізмам / М.В. Сафонаў // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. — 1990. — № 4.

Прааналізуйце мэты, якія ставілі кіруючыя колы Польскай дзяржавы пад час польскай інтэрвенцыі на тэрыторыю Беларусі ў лютым 1919 г. і савецка-польскай вайны 1920 г. Асвяціце ход ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі і ўмовы падпісання мірнага дагавора.

Вызначце прычыны, што выклікалі ўздым барацьбы супраць акупантаў, і асноўныя яе формы. Якія палітычныя партыі і арганізацыі кіравалі барацьбой беларускага народа супраць польскай інтэрвенцыі?

Адказваючы на трэцяе пытанне, высветліце, як адносіліся дзеячы Рады БНР і іншыя беларускія арганізацыі да дзеянняў Польшчы. Чым быў выкліканы раскол Рады БНР на Найвышэйшую Раду БНР і на Народную Раду БНР у кастрычніку 1919 г.? Вынікі гэтага расколу.

## ТЭМА 26 Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва на Беларусі ў 1919–1926 гг.

1. Утварэнне БССР.
2. Аб’яднанне Беларускай ССР з Літоўскай ССР.
3. Аднаўленне Беларускай ССР.
4. Пашырэнне межаў БССР у 1924 і 1926 гг. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа. Канстытуцыя БССР 1927 г.

### Літаратура


1. Борьба коммунистов-белорусов за создание национального государства на советской основе // Государственность Беларуси: Проблемы формирования в программах политических партий / В.К. Коршук [и др.]. — Минск : БГУ, 1999.
2. Гартны, Ц. (Жылуновіч, З.). Напярэдадні абвяшчэння рэспублікі / Ц. Гартны (З. Жылуновіч) // Маладосць. — 1988. — № 10.
3. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. Ч. 2. XIX–XX стст. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. — Мінск : РІВШ БДУ, 2002.
4. Игнатенко, И.М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии / И.М. Игнатенко. — Минск : Наука и техника, 1992.
5. Калубовіч, А. Айцы БССР і іх лёс / А. Калубовіч // Спадчына. — 1990. — № 3–4.
6. Круталевич, В.А. На путях самоопределения: БНР–БССР–РБ / В.А. Круталевич. — Минск : Право и экономика, 1995.
7. Круталевич, В.А. Рождение Белорусской советской республики / В.А. Круталевич. — Минск : Наука и техника, 1975.

8. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / пад рэд. М.П. Касцюка [і інш.]. — Ч. 2. — Мінск : Беларусь, 1995.
9. Талкачоў, В. Цяжкі студзень 1919 г. Да пытання аб стварэнні Літ-Бел ССР / В. Талкачоў // Беларуская думка. — 1994. — № 1.
10. Юхо, Я. Беларускія ўрады 1918–1921 гг. і іх паўнамоцтвы / Я. Юхо // Беларускі гістарычны часопіс. — 1993. — № 4.

Разглядаючы першае пытанне, неабходна прааналізаваць дзейнасць Беларускага нацыянальнага камісарыята пры Наркамнацы РСФСР па справах нацыянальнасцей (Белнацкама) і беларускіх секцый РКП(б) у адносінах да беларускай дзяржаўнасці. Вызначце прычыны выступленняў Аблвыканкамзаха, прадстаўнікоў бальшавіцкага і савецкага кіраўніцтва на Беларусі супраць самавызначэння Беларусі. Якімі органамі, установамі і асобамі прымалася рашэнне аб утварэнні на Беларусі суверэннай Савецкай рэспублікі? У якіх межах была абвешчана Беларуская ССР і якія змены былі ўнесены ў студзені 1919 г.? Прасачыце працэс фарміравання першага ўрада БССР і іншых кіруючых органаў.

Адказваючы на другое пытанне, высветліце прычыны стварэння ЛітБел ССР, дайце ацэнку І з’езду Саветаў БССР і яго рашэнням. Як ішло фарміраванне кіруючых органаў ЛітБел ССР, хто ўвайшоў у іх склад?

Па трэцім пытанні вызначце, пад уплывам якіх падзей адбылося другое абвяшчэнне БССР, якую ролю ў гэтым працэсе адыграў мірны дагавор паміж Расіяй і Літвой ад 12 ліпеня 1920 г.? Якая тэрыторыя ўвайшла ў склад БССР? ІІ Усебеларускі з’езд Саветаў і яго пастановы.

У заключнай частцы работы пакажыце, як змянялася тэрыторыя БССР на працягу 20-х гадоў, чым гэта было выклікана. Вызначце змест адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы. Канстытуцыя 1927 г. і яе асаблівасці.

## ТЭМА 27 Сацыяльна-эканамічны і культурны ўздым 20-х гг.

1. Асаблівасці пасляваеннай сітуацыі на Беларусі.
2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё рэспублікі ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі ў 1921–1928 гг.
3. Палітыка беларусізацыі. Развіццё культуры.

### Літаратура


1. Белорусизация как выражение политики КП(б)Б в национально-государственном и культурном строительстве // Государственность Беларуси: Проблемы формирования в программах политический партий / В.К. Коршук [и др.]. — Минск : БГУ, 1999.
2. Бяспалая, М. Беларуская вёска ў першыя гады нэпа (1921–1923) / М. Бяспалая. — Мінск : БУК, 1999.
3. Бяспалая, М. Эканамічнае развіццё беларускай вёскі (20-я гг. XX ст.) / / М. Бяспалая // Беларускі гістарычны часопіс. — 1997. — № 1.
4. Дубянецкі, Э. Чаму вучыць мінулае. Як праходзіла беларусізацыя школ у 20-я гады / Э. Дубянецкі // Настаўніцкая газета. — 1991. — 6 лютага.
5. Дубянецкі, Э. Беларусізацыя ВНУ: вопыт 20-х гадоў / Э. Дубянецкі // Настаўніцкая газета. — 1991. — 18 верасня.
6. Іофе, Э. Развіццё беларускай савецкай навукі і культуры ў 1921–1925 гг. / Э. Іофе // Народная асвета. — 1982. — № 8.
7. Кароль, А. Беларусізацыя — палітыка нацыянальнага адраджэння / А. Кароль // Крыжовы шлях. — Мінск : Беларусь, 1993.
8. Ходзін, С.М. Беларуская вёска ад Дэкрэта аб зямлі да суцэльнай калектывізацыі / С.М. Ходзін // Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён : зб. артыкулаў. — Мінск, 1992.
9. Эканамічная гісторыя Беларусі : вучэбны дапаможнік / пад агульн. рэд. В.І. Галубовіча. — Мінск : Экаперспектыва, 1999.


У адказе на першае пытанне неабходна разгледзець асаблівасці пасляваеннай сітуацыі на Беларусі, у тым ліку палітычныя выступленні супраць Савецкай улады, праявы незадаволенасці сялян і іх прычыны, утварэнне часцей асобага прызначэння (ЧАП). З чым было звязана абвастрэнне гаспадарчага крызісу і ў чым ён выявіўся?

Адказваючы на другое пытанне, прааналізуйце пераход да новай эканамічнай палітыкі ва ўмовах Беларусі, сутнасць нэпа. Пералічыце мерапрыемствы нэпа ў галіне сельскай гаспадаркі. Асвяціце дзейнасць Д.Ф. Прышчэпава. У чым выявіўся нэп у прамысловасці? Падвядзіце вынікі эканамічнага развіцця Беларусі ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі. Прааналізуйце су-

пярэчнасці паміж нэпам і канцэпцыяй безтаварнага сацыялізму, крызіс нэпа, передумовы яго згортвання і асноўныя ўрокі.

У адказе на трэцяе пытанне дайце азначэнне беларусізацыі. Ахарактарызуйце кожны з этапаў беларусізацыі:

1. Складанне передумоў (1921— пач. 1924 г.);
2. Рэальнае ажыццяўленне (1924–1928 гг.);
3. Згортванне (з 1929 г.).

Вызначце поспехі і дасягненні гэтай палітыкі, а таксама цяжкасці на яе шляху. Значэнне беларусізацыі для беларускага народа. Лёс «нацдэмаў».

## ТЭМА 28 Эканамічнае развіццё Беларусі ў гады першых пяцігодак. Усталяванне таталітарнага рэжыму (1928 — чэрвень 1941 г.)

1. Сацыялістычная індустрыялізацыя.
2. Прымусовая калектывізацыя сельскай гаспадаркі.
3. Усталяванне таталітарнага рэжыму. Масавыя рэпрэсіі.

### Літаратура


1. Адамушка, У. Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі / У. Адамушка. — Мінск : Беларусь, 1994.
2. Аляхновіч, Ф. У капцюрох ГПУ / Ф. Аляхновіч. — Мінск : Беларусь, 1994.
3. Возвращённые имена: Сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в период сталинских репрессий // сост. и автор предис. Н.В. Токарев. — Минск : Наука и техника, 1992.
4. Врублевский, А.П. Из истории репрессий против белорусского крестьянства, 1929–1934 гг. / А.П. Врублевский, Т.С. Протько. — Минск : Наука и техника, 1992.
5. Вышынскі, У.І. Індустрыялізацыя БССР / У.І. Вышынскі // Актуальныя пытанні гісторыі БССР. Савецкі перыяд / пад рэд. У.Н. Сідарцова. — Мінск : Нар. асвета, 1991.
6. Касцюк, М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М. Касцюк. — Мінск : Экаперспектыва, 2000.
7. Кузнецов, М.В. Коллективизация: трудные пути / М.В. Кузнецов // Страницы истории компартии Белоруссии: Суждения, аргументы, факты / под ред. Р.П. Платонова. — Минск : Университетское, 1990.
8. Осмоловский, В.П. Индустриализация республики: некоторые аспекты проблемы (1926–1935 гг.) / В.П. Осмоловский // Страницы истории компартии Белоруссии: Суждения, аргументы, факты / под ред. Р.П. Платонова. — Минск : Университетское, 1990.
9. Платонаў, Р. АДПУ–НКУС супраць беларускіх пісьменнікаў / Р. Платонаў // Беларускі гістарычны часопіс. — 1994. — № 3.
10. Сарокін, А.Церніі калектывізацыі / А. Сарокін // Полымя. — 1990. — № 2.

Перш за ўсё неабходна высветліць, калі дзяржава бярэ курс на індустрыялізацыю, даць азначэнне гэтаму працэсу, вызначыць яго мэты і сродкі ажыццяўлення. Якія асаблівасці гэтай палітыкі выявіліся на Беларусі? Прааналізуйце прамысловае будаўніцтва ў гады першых пяцігодак, стварэнне энергетычнай базы, рост рабочага класа, укараненне розных форм спаборніцтва і выкарыстанне экстэнсіўных метадаў гаспадарання. Выдзяліце прычыны рэзкага зніжэння тэмпаў прамысловага росту ў другой і трэцяй пяцігодках. Падвядзіце вынікі індустрыялізацыі ў Савецкай Беларусі. Якая была іх цана?

Адказваючы на другое пытанне, ахарактарызуйце становішча ў сельскай гаспадарцы ў канцы 20-х гг. Вызначце, з якой прычыны дзяржаўнае і партыйнае кіраўніцтва краіны адмовілася ад прынцыпаў кааперацыі і перайшло да палітыкі «суцэльнай калектывізацыі». Як праходзіў гэты працэс? Дайце ацэнку палітыкі «ліквідацыі кулацтва як класа». Якія формы супраціўлення сялянства калектывізацыі мелі месца на Беларусі? Хто такія дваццаціпяцітысячнікі? Прааналізуйце вынікі ажыццяўлення палітыкі калектывізацыі: рэзкі спад сельскагаспадарчай вытворчасці, пагаршэнне матэрыяльнага становішча народа, рэпрэсіі супраць сялян.

Разглядаючы апошняе пытанне, вызначце прычыны ўзмацнення таталітарнага рэжыму ў канцы 20-х — 30-я гг., выдзяліце рысы, характэрныя для таталітарнага грамадства, у эканоміцы і грамадска-палітычным жыцці. Вызначце прычыны масавых рэпрэсій супраць інтэлігенцыі («нацдэмаў» і інш.), сялянства, рабочых, вайскоўцаў. Пакажыце трагічны лёс рээмігрантаў. Вынікі масавых рэпрэсій для Беларусі.

## ТЭМА 29 Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы (1921–1939 гг.)

1. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча Заходняй Беларусі.
2. Нацыянальна-вызваленчы, сялянскі і рабочы рух.
3. Аб’яднанне беларускага народа ў складзе БССР.

## Літаратура


1. Вабішчэвіч, А. Нацыянальная школа ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. Вабішчэвіч // Беларускі гістарычны часопіс. — 1994. — № 2.
2. Кухарев, Б.Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии 1919–1939 гг. / Б.Е. Кухарев. — Минск : Наука и техника, 1975.
3. Ладысев, В.Ф. В борьбе за демократические права и свободы: (Из исторического опыта Компартии Западной Белоруссии, 1926–1938 гг.) / В.Ф. Ладысев. — Минск : Беларусь, 1988.
4. Ладысев, В.Ф. Коммунистическая партия Западной Белоруссии / В.Ф. Ладысев // Палітычныя партыі Беларусі : дапаможнік для вывучаючых гісторыю Беларусі. — Мінск : Беларусь, 1994.
5. Ладысеў, В.Ф. Беларуская хрысціанская дэмакратыя — Беларускае народнае аб'яднанне / В.Ф. Ладысеў // Палітычныя партыі Беларусі : дапаможнік для вывучаючых гісторыю Беларусі. — Мінск : Беларусь, 1994.
6. Ладысеў, В.Ф. Некаторыя актуальныя пытанні метадалогіі і тэорыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі / В.Ф. Ладысеў // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь. — Ч. 1. — Мінск, 1994.
7. Полуян, В.А. Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929–1933 гг. / В.А. Полуян. — Минск : Наука и техника, 1991.
8. Полуян, В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.) / В.А. Полуян. — Минск : Наука и техника, 1978.
9. Хаўратовіч, І. Заходняя Беларусь / І. Хаўратовіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 3. — Мінск, 1996.


Адказваючы на першае пытанне, спачатку высветліце, якія беларускія землі трапілі пад уладу Польшчы; колькі тут пражывала насельніцтва, яго нацыянальны склад; адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел і новыя органы кіравання. Ахарактарызуйце стан прамысловасці ва ўмовах цыклічнага развіцця, асноўныя галіны вытворчасці, становішча рабочых. Якія праблемы меліся ў развіцці сельскай гаспадаркі? Сэнс і мэты аграрных пераўтварэнняў польскіх улад (парцэляцыя, камасацыя, асадніцтва), іх вынікі. Міграцыя беларусаў у краіны Захаду. У чым выяўляўся палітычны і нацыянальна-культурны ўціск польскага ўрада ў Заходняй Беларусі? Ахарактарызуйце менталітэт заходнебеларускага насельніцтва ў параўнанні з усходнебеларускім.

Адказваючы на другое пытанне, пакажыце расстаноўку палітычных сіл у вызваленчым руху ў Заходняй Беларусі, апішыце дзейнасць беларускіх рэвалюцыйных і нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый (БРА, КПЗБ, БХД і інш.). Партызанскі рух у першыя гады польскага панавання. Вызначце прычыны пераходу ад тактыкі партызанскай барацьбы да палітычнай і арганізацыйнай работы ў масах: выбары ў Сейм, утварэнне БСРГ,

клуба «Змаганне», ТБШ. Назавіце дзеячаў беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі. Прааналізуйце формы супраціўлення польскай рэакцыі ў 30-я гг.: забастовачны рух, выступленні сялян, стварэнне адзінага антыфашысцкага фронту. Як ставілася кіраўніцтва ВКП(б) і КП(б)Б да палітычных партый Заходняй Беларусі? Трагічны лёс КПЗБ і яе членаў.

Разглядаючы апошняе пытанне, прааналізуйце палітычныя перадумовы ўключэння Заходняй Беларусі ў склад БССР (пакт аб ненападзенні і сакрэтныя пратаколы). Як адбываўся працэс уключэння Заходняй Беларусі ў склад БССР, якія органы вырашалі гэтыя пытанні? Асвяціце перадачу Віленскага краю Літве.

## ТЭМА 30 Беларусь напярэдадні і ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны

1. БССР напярэдадні нападу фашысцкай Германіі.
2. Абарончыя баі Чырвонай Арміі і прычыны яе паражэнняў на пачатковым этапе вайны.
3. Нямецка-фашысцкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі.

### Літаратура


1. Андрющенко, Н.К. На земле Белоруссии летом 1941 г. / Н.К. Андрющенко. — Минск : Наука и техника, 1985.
2. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 : энцыклапедыя. — Мінск : БелСЭ, 1990.
3. Бурдо, А. З хронікі баёў за Віцебск / А. Бурдо // Віцебскі рабочы. — 1991. — 3 снежня.
4. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны) : вуч. дапаможнік для студэнтаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / А.А. Каваленя [і інш.]. — Мінск : БДУ, 2004.
5. Долготович, Б.Д. Беларусь в годы Великой Отечественной войны в вопросах и ответах / Б.Д. Долготович. — Минск : Полымя, 1994.
6. Литвин, А. Как это было: бои в Беларуси, июнь–август 1941 г. / А. Литвин // Неман. — 1991. — № 6.
7. Лихачев, В. В 1941-м под Полоцком: Малоизвестные страницы обороны Полоцка / В. Лихачев // Политический собеседник. — 1991. — № 8.
8. Разанаў, Г.Л. Сталін–Гітлер: Дакументальны нарыс савецка-германскіх дыпламатычных адносін, 1939–1941 / Г.Л. Разанаў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1991.
9. Шумейко, М. Если завтра война...: Военно-политическая обстановка в Белоруссии накануне Великой Отечественной войны / М. Шумейко // Белорусская нива. — 1991. — 20 июня.

Па першым пытанні неабходна вызначыць супярэчнасці ў сацыяльна-эканамічным, палітычным і духоўным жыцці рэспублікі напярэдадні вайны. Прааналізуйце промахі і злачынствы сталінскага кіраўніцтва пры падрыхтоўцы краіны да вайны, суадносіны ваенных сіл Германіі і СССР, параўнайце войскі Заходняй асобай акругі (ЗахАВА) і сілы фашысцкай Германіі, якія ім супрацьстаялі.

Адказваючы на другое пытанне, асвяціце першы этап абарончых баёў на тэрыторыі Беларусі, трагедыю войск 3-й і 10-й армій. Прааналізуйце дзейнасць органаў Савецкай улады і Кампартыі па арганізацыі абароны: мабілізацыя, эвакуацыя, народнае апалчэнне. Раскажыце аб баях пад Мінскам, Бабруйскам, Оршай, Віцебскам, Магілёвам, Гомелем і падвядзіце вынікі двухмесячнага змагання савецкіх войскаў на Беларусі. У чым прычыны паражэнняў Чырвонай Арміі на пачатковым этапе вайны?

У адказе на трэцяе пытанне высветліце планы, якія мелі нямецкія акупацыйныя ўлады ў дачыненні да захопленых беларускіх зямель. На якія часткі была падзелена Беларусь і які акупацыйны апарат кіравання быў створаны? Ахарактарызуйце асноўныя накірункі фашысцкай палітыкі генацыду: рэалізацыя плана «Ост»; карныя экспедыцыі; канцэнтрацыйныя лагеры і турмы, гета; выгнанне насельніцтва на катаржныя работы ў Германію. Прааналізуйце эканамічную палітыку нямецка-фашысцкіх акупацыйных уладаў, яе сутнасць і асноўныя этапы.

## ТЭМА 31 Беларусь ва ўмовах нямецкай акупацыі 1941–1944 гг. Вызваленне Беларусі

1. Партызанская і падпольная барацьба супраць фашысцкіх захопнікаў на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.
2. Калабарацыяніцкі рух.
3. Вызваленне Беларусі. Вынікі вайны для беларускага народа.

## Літаратура


1. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны) : вуч. дапаможнік для студэнтаў установ, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / А.А. Каваленя [і інш.]. — Мінск : БДУ, 2004.
2. Долготович, Б.Д. Беларусь в годы Великой Отечественной войны в вопросах и ответах / Б.Д. Долготович. — Минск : Полымя, 1994.
3. Каваленя, А.А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі, 1941–1944: Вытокі. Структура. Дзейнасць / А.А. Каваленя. — Мінск : БДПУ, 1999.
4. Калюта, В.В. Проблемы становления белорусского подполья в начальный период Великой Отечественной войны / В.В. Калюта // Веснік БГУ. Серыя 3: Гісторыя. Філасофія. Эканоміка. Права. —1991. — № 3.
5. Лемешонок, В. Героические страницы освобождения Белоруссии: операция «Багратион» / В. Лемешонок. — Минск : Наука и техника, 1988.
6. Лемяшонак, У.І. Вызваленне — без грыфа «Сакрэтна!» / У.І. Лемяшонак. — Мінск : Полымя, 1996.
7. Літвін, А. Акупацыя Беларусі (1941–1944): Пытанні супраціву і калабарацыі / А. Літвін. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2000.
8. Літвін, А. Армія Краёва на Беларусі / А. Літвін // Беларускі гістарычны часопіс. — 1994. — № 1, 4.
9. Соловьев, А.К. Белорусская Центральная Рада: создание, деятельность, крах / А.К. Соловьев. — Минск : Право и экономика, 1995.
10. Тимохович, И.В. Битва за Белоруссию, 1941–1944 / И.В. Тимохович. — Минск : Беларусь, 1994.


У першай частцы работы пакажыце працэс разгортвання народнай барацьбы супраць акупантаў: першыя падпольныя камітэты і партызанскія атрады, наладжванне дзейнасці КП(б)Б ва ўмовах акупацыі. Вызначце асноўныя этапы развіцця партызанскага руху на Беларусі і яго размах, адносіны насельніцтва да партызан. Прааналізуйце асаблівасці падпольнага руху, антыфашысцкіх патрыятычных арганізацый ў заходніх абласцях рэспублікі. Даследуйце польскі партызанскі рух у межах Заходняй Беларусі (Армія Краёва), яго мэты і тактыку барацьбы. Вызначце ўклад падпольшчыкаў і партызан у агульную перамогу.

Па другім пытанні неабходна вызначыць дзве лініі берлінскай усходняй палітыкі ў дачыненні да «беларускага пытання». Прасачыце ўзнікненне ва ўмовах акупацыі беларускіх нацыянальных палітычных рухаў і арганізацый, дзейнасць БЦР, правядзенне другога Усебеларускага кангрэса. Якія мэты ставілі перад сабой беларускія калабарацыяністы? Іх лёс.

Па трэцім пытанні трэба высветліць, калі пачалося вызваленне тэрыторыі Беларусі і якія сілы ў гэтым удзельнічалі. Хто займаўся распрацоўкай наступальнай аперацыі «Баграціён»? Этапы і вынікі аперацыі «Баграціён». Расскажыце аб найбольш буйных бітвах і подзвігах савецкіх воінаў. Падвядзіце вынікі вайны для Беларусі.

## ТЭМА 32 БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе (1945–1955 гг.)

1. Людскія і матэрыяльныя страты, нанесеныя рэспубліцы за гады вайны. Аднаўленне і развіццё прамысловасці, транспарту.
2. Становішча ў сельскай гаспадарцы. Калектывізацыя ў заходніх абласцях рэспублікі.
3. Грамадска-палітычнае жыццё рэспублікі.
4. Выхад Беларусі на міжнародную арэну.

### Літаратура


1. Адамушка, У. Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі / У. Адамушка. — Мінск : Беларусь, 1994.
2. Болбас, М. Возрождение народного хозяйства Белоруссии / М. Болбас // Экономические науки. — 1985. — № 4.
3. Кузняцоў, М.В. Пасляваеннае аднаўленне і развіццё: ад спроб рэфармавання — да крызісу адміністрацыйна-каманднай сістэмы / М.В. Кузняцоў // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. — Мінск : БелЭН, 2000.
4. Лыч, Г. Трагедыя беларускага сялянства / Г. Лыч. — Мінск : Право и экономика, 2003.
5. Марчанка, І. Гарады Беларусі: аднаўленне і развіццё / І. Марчанка // Беларускі гістарычны часопіс. — 1994. — № 3.
6. Снапковский, В.Е. Белорусская ССР в ООН (1945–1985 гг.) / В.Е. Снапковский. — Минск : Наука и техника, 1985.
7. Снапковский, В.Е. Путь Беларуси в ООН. 1944–1945 гг. / В.Е. Снапковский. — Минск : Наука и техника, 1994.
8. Снапкоўскі, У.Е. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі: 1944–1953 гг. / У.Е. Снапкоўскі. — Мінск : Бел. навука, 1997.
9. Храпко, Л.П. Уплыў грамадска-палітычнай сітуацыі другой паловы 40-х — першай паловы 50-х гг. на развіццё гістарычнай навукі ў БССР / Л.П. Храпко // Старонкі гісторыі Беларусі. — Мінск, 1992.
10. Эканамічная гісторыя Беларусі. — Мінск : Экаперспектыва, 1999.


Пачынаючы адказ на першае пытанне, неабходна паказаць страты, якія панесла Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны, вызначыць памеры

ваенных разбурэнняў і шляхі пераадолення іх вынікаў. Першыя крокі па аднаўленні народнай гаспадаркі. Прааналізуйце працэс фарміравання новых галін прамысловасці, «зборачнага цэха» савецкай імперыі, вызначце яго экстэнсіўны і стратны характар. Як адбывалася аднаўленне транспарту?

Ахарактарызуйце становішча ў сельскай гаспадарцы БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе: аднаўленне калгасна-саўгаснага ладу; калектывізацыя ў Заходняй Беларусі; прычыны паглыблення крызісу сельскай гаспадаркі ў канцы 40-х гг.; узбуйненне калгасаў у пачатку 50-х гг., сутнасць мерапрыемстваў, накіраваных на вывад сельскай гаспадаркі з крызіснага стану; вынікі іх ажыццяўлення.

Адказваючы на трэцяе пытанне, трэба прааналізаваць, як суадносіліся канстытуцыя і рэальныя прынцыпы дзяржаўнасці БССР. У чым выявіліся дыктатура цэнтра, узмацненне адміністрацыйна-каманднай сістэмы і культу асобы Сталіна на Беларусі? У адносінах да якіх пластоў грамадства ажыццяўляліся рэпрэсіі на Беларусі ў канцы 40-х — пачатку 50-х гг.? Прывядзіце прыклады. Раскажыце аб існаванні нацыянальных арганізацый беларускай моладзі, іх мэтах і лёсе ўдзельнікаў.

Аналізуючы становішча Беларусі на міжнароднай арэне, раскажыце аб яе ўдзеле ў стварэнні ААН і ініцыятывах у рамках гэтай арганізацыі. Хто быў першым міністрам замежных спраў БССР? Вызначце рэальны статус БССР у супольнасці краін свету.

## ТЭМА 33 БССР у сярэдзіне 50-х — 80-х гг.

1. Грамадска-палітычнае жыццё.
2. Развіццё эканомікі. Прамысловасць БССР ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі (НТР).
3. Стан сельскай гаспадаркі.
4. Матэрыяльнае становішча насельніцтва.

## Літаратура

1. Актуальныя пытанні гісторыі БССР. — Мінск : Навука і тэхніка, 1991.
2. Агееў, А. Фарміраванне палітычнай эліты БССР у паслясталінскі час / А. Агееў // Беларуская мінуўшчына. — 1994. — № 4.
3. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. / пад рэд. Новіка Я.К., Марцуля Г.С. — Мінск : Выш. школа, 2006.
4. Гісторыя Беларусі : вучэбны дапаможнік для ВНУ / пад рэд. А.Г. Каханоўскага, А.А. Яноўскага. — Мінск : Эканомпрэс, 1997.
5. Гісторыя Беларусі : навучальны дапаможнік / А.Г. Каханоўскі [і інш.]. — Мінск: ФУАінфарм, 2001.
6. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. Ч. 2. XIX–XX стст. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. — Мінск : РІВШ БДУ, 2002.
7. Чигринов, П.Г. История Беларуси с древности до наших дней : учеб. пособие / П.Г. Чигринов. — Минск : Книжный дом, 2004.
8. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / пад рэд. М.П. Касцюка [і інш.]. — Ч. 2. — Мінск : Беларусь, 1995.
9. Саракавік, І.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.А. Саракавік. — Мінск : Современная школа, 2006.
10. Эканамічная гісторыя Беларусі / пад рэд. В.І. Галубовіча. — Мінск : Экаперспектыва, 1999.

Пакажыце, што пасля смерці І.В. Сталіна ў краіне пачынаецца працэс дэмакратызацыі грамадскага развіцця. У якой ступені дэмакратызацыя закранула дзейнасць КПСС, КПБ, Саветаў, прафсаюзаў, камсамола і іншых так званых грамадскіх арганізацый? Раскажыце аб рэабілітацыі ахвяраў сталінскіх рэпрэсій на Беларусі. Калі гэты працэс зноў спыніўся? Вызначце змены ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі пасля 1964 г.

Вызначце сутнасць НТР і асноўныя напрамкі яе развіцця. У чым выявіўся ўплыў НТР на развіццё прамысловасці Беларусі ў 60–80-я гг.? Высвятліце прычыны неабходнасці рэфармавання народнай гаспадаркі ў другой палове 60-х гг. Сутнасць рэформы ў галіне прамысловасці і яе вынікі. Галіновая структура прамысловасці Беларусі ў 70-х — першай палове 80-х гг. Вынікі прамысловага развіцця ў канцы 70-х — першай палове 80-х гг.

Прааналізуйце ўплыў НТР на сельскую гаспадарку Беларусі, спробы паляпшэння кіравання сельскай гаспадаркай і яе пераводу на інтэнсіўны шлях развіцця ў 60–70-х гг. У чым прычыны правалу гэтых мерапрыемстваў?

У заключнай частцы работы разгледзьце ўплыў НТР на змяненні ў сацыяльным складзе насельніцтва Беларусі, спробы вырашэння сацыяльных праблем. Змены ў матэрыяльным і сацыяльным становішчы калгаснікаў, рабочых, інтэлігенцыі.

## ТЭМА 34 Беларусь на шляху сістэмных пераўтварэнняў (1985–2007 гг.)

1. Перабудова і яе вынікі. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь.
2. Грамадска-палітычнае развіццё РБ на сучасным этапе. Канстытуцыя РБ.
3. Незалежная Беларусь у сістэме міжнародных адносін.

### Літаратура


1. Барыс, А. Сучасныя партыі на Беларусі / А. Барыс // Беларускі гістарычны часопіс. — 1995. — № 1.
2. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. Ч. 2. XIX–XX стст. / П.І. Брыгадзін [і інш.]. — Мінск : РІВШ БДУ, 2002.
3. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. — Мінск : Беларусь, 1996.
4. Круталевіч, В. Четыре этапа независимости. К истории провозглашения белорусской государственности / В. Круталевіч // Беларуская думка. — 1992. — № 1.
5. Лойка, Л. Беларусь у геапалітыцы / Л. Лойка // Звязда. — 1992. — 19–22 мая.
6. Лойка, Л. Нататкі палітолага: Жнівеньскі путч 1991 г. і незалежнасць Беларусі / Л. Лойка // Звязда. — 1991. — 20–28 верасня.
7. Лыч, Л.М. Нацыянальная свядомасць беларусаў: Дэградацыя і адраджэнне / Л.М. Лыч // Літаратура і мастацтва. — 1990. — 4, 11 мая.
8. Сердюков, Н. Заметки о независимости / Н. Сердюков // Неман. — 1992. — № 3.
9. Содружество Независимых Государств: портрет на фоне перемен. — Минск : Пангроф, 1996.
10. Шадурский, В.Г. Культурные связи Беларуси со странами Центральной и Западной Европы / В.Г. Шадурский. — Минск : БГУ, 2000.


Адказ на першае пытанне трэба пачаць з разгляду праблемы перабудовы: неабходна асвяціць такія падзеі, як пераход улады ў рукі Саветаў, правядзенне новых выбараў народных дэпутатаў БССР і мясцовых Саветаў рэспублікі на конкурснай аснове, дзейнасць Вярхоўнага Савета Беларусі ва ўмовах незалежнасці ад партыйных органаў. Звярніце ўвагу на цяжкасці і перашкоды на шляху маладой дэмакратыі ў рэспубліцы. Стварэнне БНФ і іншых палітычных рухаў і партый, асноўныя рысы іх дзейнасці. Жнівеньскі (1991 г.) путч і яго ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі. Дэпартызацыя органаў улады і кіравання на Беларусі, дзяржаўных прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый. Затым неабходна ацаніць прыняцце Вярхоўным Саветам БССР Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР 27 ліпеня 1990 г., а потым наданне Дэкларацыі статуса канстытуцыйнага закона 25 жніўня 1991 г. Які ўдзел прыняла Рэспубліка Беларусь у распрацоўцы Дагавора аб Садружнасці Незалежных Дзяржаў?

Беларусь — прэзідэнтская рэспубліка. Прэзідэнцкія выбары 1994, 2001, 2006 гг. А.Р. Лукашэнка — Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Рэспубліканскія рэферэндумы 1995, 1996, 2004 гг. і іх рашэнні. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

Па трэцім пытанні неабходна паказаць рост аўтарытэту Беларусі на міжнароднай арэне на сучасным этапе, яе знешнепалітычныя сувязі і кантакты, перабудову гандлёва-эканамічных і навуковых сувязей рэспублікі з іншымі краінамі. Якія склаліся новыя формы знешнеэканамічных адносін, культурных сувязей Рэспублікі Беларусь з замежнымі краінамі? Як развіваюцца адносіны ў рамках СНД?

## ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

1. Перыядызацыя гісторыі Беларусі.
2. Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі Беларусі.
3. Каменны і бронзавы век на беларускіх землях.
4. Жалезны век на Беларусі.
5. Этнічныя працэсы на беларускіх землях: са старажытнасці да X ст.
6. Матэрыяльная і духоўная культура крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў.
7. Полацкае княства ў IX–XI стст.
8. Тураўскае княства ў IX–XI стст.
9. Феадальная дробнасць на беларускіх землях (XII — сярэдзіна XIII ст.).
10. Барацьба са знешняй агрэсіяй у XIII ст.
11. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у IX–XIII стст.
12. Прынядце хрысціянства. Рэлігія і культура.
13. Праблема паходжання беларусаў.
14. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага: ад Міндоўга да Віценя.
15. ВКЛ пры Гедыміне, Альгердзе, Вітаўце.
16. Барацьба з крыжацкай агрэсіяй.
17. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у другой палове XIII — XV ст.
18. Культура беларускіх зямель у другой палове XIII — XV ст.
19. Фарміраванне беларускай народнасці.
20. Дзяржаўна-палітычны лад ВКЛ.
21. Знешнепалітычнае становішча ВКЛ у XУI ст. Люблінская унія: прычыны і ўмовы.
22. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у XVI — сярэдзіне XVII ст. Аграрная рэформа 1557 г.
23. Рэлігійная сітуацыя ў ВКЛ (праваслаўе і каталіцызм, Рэфармацыя, Брэсцкая царкоўная унія).
24. Войны сярэдзіны XVII — пачатку XVIII ст.
25. Крызіс Рэчы Паспалітай і спробы рэформ у дзяржаве.
26. Падзелы Рэчы Паспалітай. Паўстанне Т. Касцюшкі.
27. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел і сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі пасля далучэння да Расіі.
28. Вайна 1812 г. на Беларусі.
29. Грамадска-палітычны рух і ўрадавая палітыка Расіі ў першай палове XIX ст.
30. Тэндэнцыі культурнага развіцця ў першай палове XIX ст.

31. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XIX ст.
32. Грамадска-палітычны рух і палітыка царызму ў другой палове XIX ст.
33. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. на Беларусі. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у 1906–1913 гг. Аграрная рэформа П.А. Сталыпіна.
34. Фарміраванне беларускай нацыі. Культура Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст.
35. Беларусь у пачатку Першай сусветнай вайны.
36. Перамога Лютаўскай рэвалюцыі. Палітычная барацьба на Беларусі ў лютым–кастрычніку 1917 г.
37. Перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі. Першыя мерапрыемствы Савецкай улады.
38. Беларускі нацыянальны рух у лютым–снежні 1917 г.
39. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі і дзейнасць яе ўрадавых структур.
40. Утварэнне БССР.
41. Беларусь у гады савецка-польскай вайны.
42. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў Савецкай Беларусі (1921–1926).
43. Савецкая Беларусь ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі (1921–1929).
44. БССР у 30-я гг.: усталяванне таталітарнага рэжыму.
45. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы. Уз’яднанне беларускага народа.
46. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі.
47. Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі. Беларуская калабарацыя.
48. Падпольная барацьба і партызанскі рух.
49. Вызваленне Беларусі ад нямецкіх акупантаў. Заканчэнне Другой сусветнай вайны.
50. Аднаўленне народнай гаспадаркі БССР (1945 — пачатак 50-х гг.).
51. Грамадска-палітычнае становішча ў БССР.
52. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у сярэдзіне 50-х — пачатку 80-х гг.
53. Перабудова і яе вынікі. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь.
54. Грамадска-палітычнае развіццё РБ на сучасным этапе. Канстытуцыя РБ.
55. Беларусь у сістэме міжнародных адносін (1945–2005).
56. Тэндэнцыі культурнага развіцця РБ на сучасным этапе (адукацыя, навука, літаратура, мастацтва).

Вучэбнае выданне

**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ**

***Метадычныя рэкамендацыі***
***і тэматыка кантрольных работ***
***для студэнтаў дзённага і завочнага аддзяленняў***

Складальнікі
**Маскалёў Валянцін Георгіевіч**
**Шумскі Канстанцін Анатольевіч**

Адказны за выпуск *І.Г. Падпорын*
Рэдактары *Н.Ф. Крыцкая, С.С. Ядранцава*
Камп’ютэрная вёрстка *Н.Ф. Крыцкая*